Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 266 (5099) ЛІСТАПАДА 28 СЕРАДА 1934 г. год выдання XVI

„... Самае важнае з пункту гледжання будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму.“

(СТАЛІН)

Пролетарыі всіх краін, злучайцеся!

ВЫШЭЙ СЦЯГ БАРАЦЬБЫ ЗА АЎЛАДАННЕ ТЭХНІКАЙ

Дэлегатам усебеларускага злёта зотаўцаў цяжкай прамысловасці—большэвіцкае прывітанне!

Заўтра ў Гомелі пачынае сваю работу першы ўсебеларускі злёт зотаўцаў цяжкай прамысловасці.

На злёт з усіх канцоў Беларусі прыедуць прадстаўнікі чатырох з паловай тысяч лепшых ударнікаў вытворчасці, аўладаўшых мінімумам тэхнічных ведаў.

Яны аўладалі мінімумам тэхнічных ведаў. Гэта толькі першы крок. Але крок зроблен цвёрды і ўпэўнены. Гэта крок тысяч людзей, якія па закліку партыі ўзяліся за кнігу, за чарцёж, за лінейку.

Па закліку партыі тысячы лепшых людзей выйшлі на барыкады Прэсні ў 1905 годзе, па закліку партыі яны штурмавалі Зімні палац, па закліку партыі яны абаранялі завяванні Кастрыцы на франтах грамадзянскай вайны, па закліку партыі яны-ж, не шкадуючы сваіх сіл і жыцця, змагаліся за тое, каб узяць у свае рукі ўладу, каб узяць у свае рукі сродкі вытворчасці.

Зараз краіна ўшаноўвае сваіх героеў, якія ў напружаныя дні грамадзянскай вайны авалодвалі тэхнікай ваеннай справы, вучыліся біць ворага для таго, каб зараз сотні і тысячы людзей маглі авалодваць завяванымі тады сродкамі вытворчасці.

Недарма фармоўшчык піцейнага цэха завода «Чырвоны металіст» ВАСІЛІ КРЫЦКІ гаворыць, што «ГЛЯДЖУ Я НА СЯБЕ СЁННЯ І САМОГА СЯБЕ НЕ ПАЗНАЮ. ПРАЦАВАЦЬ СТАЛА КУДЫ ЛЯГЧЭЙ І РАБОТА КУДЫ ЛЕПШАЯ».

І гэта ўсім зразумела. Толькі зараз, калі наша прамысловасць асвоілася навейшай тэхнікай, калі гэта тэхніка асвойваецца рабочымі масамі, працаваць стала лягчэй, працаваць стала радасна.

Наша прамысловасць не толькі асвоілася тэхнікай. Яна вырасла на 500 проц. у параўнанні з даваеннымі часам! Па сутнасці створана новая прамысловасць з новым абсталяваннем і новымі адносінамі да гэтага абсталявання.

Вось чаму злёт зотаўцаў цяжкай прамысловасці — не звычайнае з'явішча. Ці магла калі-небудзь марыць старая Беларусь аб тым, што тут, у Гомелі, гэтым павятовым чыноўніцкім дробна-гандлярскім горадам збяруцца людзі, якія асвоілі багеры, працяжныя варштаты, варшта ты «Ціль», «Капава» і многае, чаго не магла на працягу доўгіх год выраблянь уся Царская Расія, з усімі яе заводамі.

Ці магла калі-небудзь старая царская Беларусь марыць аб тым, што жэнскі завод «Комунар» першы ў Саюзе асвоіць складаны працяжны варштат нямецкай канструкцыі, сваімі сіламі, з совецкага метала, што людзі, якія рабілі гэты варштат, добра ведаюць не толькі асобныя дэталі, але і усю яго канструкцыю і ўзаемазалежнасць частак.

Злёт зотаўцаў—гэта дэманстрацыя нашага росту, нашых дасягненняў, агляд праробленага па ажыццяўленню ўказанняў партыі і правадыра партыі таварыша СТАЛІНА.

ЗАВАЯВАЎШЫ фабрыкі і заводы машынамі і варштатамі, АДНАВІЎШЫ разбуранае, СТВАРЫЎШЫ новую социялістычную эканоміку, перад намі стаіць першачарговая задача АЎЛАДАЦЬ НОВАЙ ТЭХНІКАЙ, аўладаць завяванымі ў баях сродкамі вытворчасці.

Вось чым можна вытлумачыць той масавы рух за аўладанне тэхнікай, які выліўся як адказ на заклік партыі і яе правадыра таварыша СТАЛІНА.

Зараз на любым нашым заводзе можны рабочы на практыцы бачыць ажыццяўленне слоў Маркса аб тым, што: «МАШЫНА САМА ПА САБЕ СКАРАЧАЕ РАБОЧЫ ЧАС, МІЖ ТЫМ ЯК ЯЕ КАПІТАЛІСТЫЧНАЕ ПРЫМЯНЕННЕ ПАДАЎЖАЕ РАБОЧЫ ДЗЕНЬ; САМА ПА САБЕ АЛЯГЧАЕ ПРАЦУ, КАПІТАЛІСТЫЧНАЕ-Ж ЯЕ ПРЫМЯНЕННЕ ПАВЫШАЕ ЯЕ ІНТЭНСІЎНАСЦЬ... САМА ПА САБЕ ЯНА ЗНАМЯНУЕ ПЕРАМОГУ ЧАЛАВЕКА КАД СІЛАМІ ПРЫРОДЫ КАПІТАЛІСТЫЧНАЕ-Ж ЯЕ ПРЫМЯНЕННЕ ПАДНЯВОЛЬВАЕ ЧАЛАВЕКА СІЛАМІ ПРЫРОДЫ».

І толькі ў нас, у совецкай краіне, створаны такія ўзаемаадносіны паміж машынай і чалавекам, калі чалавек стаў гаспадаром машыны, калі машына дапамагае чалавеку, аблягчае яго работу.

Вось чаму злёт зотаўцаў цяжкай прамысловасці — выдатная падзея не толькі для саміх зотаўцаў, але і для ўсёй краіны.

Але зотаўцы павінны будуць рашыць яшчэ адну немалаважную задачу. Мы недапушчальна адстаем. Толькі тры прадпрыемствы цяжкай прамысловасці: завод імя ВАРАШЫЛАВА, «ПРОЛЕТАРЫЙ» і АКУЛЯРНАЯ фабрыка змогуць далажыць злёту аб тым, што яны выканалі гадавы план. А астатнія? Толькі рэспубліканская цяжкая прамысловасць мае запазычанасць у 5 105 тыс. руб. Гэта занадта вялікая запазычанасць перад краінай, гэты доўг пагражае выкананню гадавога плана ўсёй прамысловасцю.

Цяжкая прамысловасць не можа застацца ў даўгу перад краінай. А яна адстае. І асабліва адстае Гомель — гэты цэнтр беларускай цяжкай прамысловасці, які мае 13 мільёнаў руб. запазычанасці з 29 млн. запазычанасці ўсёй прамысловасці.

Скіпкане злёта ў Гомелі не азначае таго, што гомельская прамысловасць заваявала на гэта права сваёй барацьбой за промфінплан і аўладанне тэхнікай.

Лепшыя зотаўцы, сабраўшыся на злёт, павінны перадаць свой вопыт барацьбы за план і аўладанне тэхнікай астатнім прадпрыемствам. Гэты вопыт павінен стаць здабыткам кожнага прадпрыемства, кожнага рабочага.

Наша задача — дабіцца выканання гадавога плана ўсёй прамысловасцю ў цэлым і кожным прадпрыемствам у паасобку за што-б там ні стала.

Наша задача — вышэй падняць сцяг барацьбы за аўладанне тэхнікай, ахапіць, тэхнічнай вучобай усіх рабочых, далей вучыць зотаўцаў. Здаць тэхнімінум на «добра» — мала. Выдатна трэба ведаць тэхніку сваёй спецыяльнасці. Рухацца наперад так, каб КОЖНЫ РАБОЧЫ ДАРОС ДА ЎЗРОЎНЮ ВЕДАЎ. МАЙСТРА А КОЖНЫ МАЙСТАР ДА ЎЗРОЎНЮ ВЕДАЎ ІНЖЫНЕРА.

Мы можам зараз смела сказаць, што гэта задача нам па плячу. За гэта гаворыць наша воля да правы і ведаў, наш выдатны рабочы клас, наша навейшае абсталяванне, нашы выдатныя інжынеры і тэхнікі.

Не спыняцца ні на адну мінуту на дасягнутым!

Вам, токарам, слесарам, ліцейшчыкам, ударнікам цагельных заводаў, хімікам, тарфянікам, хто заспіхаў ганаровую годнасць зотаўцаў,

хто праводзіць бяссонныя ночы над чарцяжамі і кнігамі, вывучаючы складаную навуку вытворчасці,

хто перадае свае веды ўсім рабочым, вучыць працаваць і аўладаць машынай,

ударнікам сталінскага штурму крэпасці тэхнікі, — гарачае большэвіцкае прывітанне!

ПЕРШАЙ УСЕБЕЛАРУСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ЗНАЧКІСТАЎ „ЗОТ“ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Знатным людзям прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці Беларусі, перадавікам большэвіцкага аўладання тэхнікай прэзідыум ЦСПСБ шле баявое пролетарскае прывітанне.

У тэхнічнай вучобе прадпрыемстваў Беларусі маюць бясспрэчныя поспехі — на 1 лістапада г. г. ахоплена тэхнічнай вучобай 56.000 чал.; значкістаў ЗОТ, здаўшых соцтэхэкзамен на «ВЫДАТНА» налічваецца 7.500 чалавек. Аднак, на гэтых поспехах мы не павінны супакойвацца.

Цяжкая прамысловасць Беларусі прыходзіць да ўсебеларускай канферэнцыі зотаўцаў са значным недавыкананнем вытворчай праграмы. Асабліва адстаюць металапрацоўчыя, хімічныя і прадпрыемствы будматарыялаў. Асноўная прычына гэтага адставання ў тым, што не ўсе магчымасці і рэсурсы намі поўнасцю выкарыстоўваюцца.

Мабілізаваць усе рэсурсы, ПОЎНАСЦЮ АЎЛАДАЦЬ МАГУТНАСЦЮ АБСТАЛЯВАННЯ — гэта і ёсць на справе асвоіць новую тэхніку, значэнне якой з непраўзойдзенай чоткасцю вызначана ў позынгу правадыра нашай партыі таварыша Сталіна: «ТЭХНІКА Ў ПЕРЫЯД РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЫРАШАЕ ЎСЁ».

Барацьба за асваенне магутнасці абсталявання на нашых прадпрыемствах і на гэтай аснове барацьба за рашучы ўздым прадукцыйнасці працы і паляпшэнне якасці прамысловай прадукцыі, соцыялістычныя адносіны да працы — ёсць ганаровы абавязак кожнага рабочага-ўдарніка, інжынерна-тэхнічнага работніка, кіруючага работніка прадпрыемства.

Гарадамі, прадпрыемствы якіх паказалі лепшыя ўзоры барацьбы за аўладанне рабочымі тэхнікай і якія ў ходзе спаборніцтва заваявалі права на скліканне ў іх усебеларускай канферэнцыі значкістаў ЗОТ, з'яўляецца Віцебск і Менск.

Правядзенне канферэнцыі ў Гомелі дыктуецца необходнасцю дапамагчы гомельскім прадпрыемствам ліквідаваць сваё адставанне як у выкананні промфінплана, так і ў ахопе рабочых тэхнічнай вучобай. Гэта павінны ўлічыць кіраўнікі і рабочыя-ўдарнікі гомельскіх прадпрыемстваў з тым, каб гэта канферэнцыя з'явілася пераломным этапам у сэнсе барацьбы за промфінплан і разгортвання тэхнічнай вучобы на прадпрыемствах.

Прэзідыум ЦСПСБ упэўнен, што ўдзельнікі канферэнцыі, абагуліўшы свой лепшы вопыт у аўладанні тэхнікай, перанясуць яго на ўсе прадпрыемствы рэспублікі, пакажуць далейшыя ўзоры барацьбы за выкананне і перавыкананне вытворчай праграмы другога года другой пяцігодкі і пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б вывядуць к VII з'езду совецкіх прадпрыемстваў беларускай прамысловасці ў пік перадавых.

Нахай жыве ЦК ВКП(б) — арганізатар перамог социялізма ў нашай краіне!

Нахай жыве наш вялікі, мудры кіраўнік — таварыш СТАЛІН!

Старшыня Цэнтральнага Совета Профсаюзаў Беларусі
З. КАВАЛЬЧУК.

АГІДНАЕ САМАУПРАЎСТВА ЯПОНСКІХ І МАНЧЖУРСКІХ ВАЕННЫХ І ПАЛІЦЭЙСКІХ ЧЫНОЎ НА КУЧ

ПРАТЭСТЫ КАМЕОКІКА ТАВАРЫША СТАРШЫНІ ПРАЎЛЕННЯ КУЧ тав. БАНДУРА

ХАБАРАЎСК, 24 лістапада (БЕЛТА). Па паведамленню з Харбіна, 15-га лістапада намеснік таварыша старшыні праўлення КУЧ т. Бандура ўручыў старшыні праўлення Лі-Шао-гену пісьмо наступнага зместу:

«Апошнія месяцы мелі месца паступовыя самаўпраўныя дзеянні і ўмяшванні ў аператыўную работу агентаў КУЧ японскіх вайсковых чыноў і службовых асоб, парушаючых правы і інтарэсы КУЧ і дезарганізуючых работу дарогі.

26-га жніўня са станцыі Байшахэ ў бок Імяньпо, не гледзячы на тое, што шлях быў заняты дапаможным поездам, накіраваўся насустрач яму японскі бронепоезд без дазволу станцыі і без жэзла і не зважаючы на папярэджанне аб запытным перагоне. Паравозам кіраваў японскі ваенны машыніст, адстранёны ад упраўлення машыніста дарогі. Сутыкненне ўнікнулі толькі дзякуючы таму, што дапаможны поезд заўважыў бронепоезд і вярнуўся на станцыю Імяньпо, куды ўслед за ім прыбыў бронепоезд. 30-га жніўня японскія вайсковыя чыны пад пагрозай зброі прымусілі ўночы адправіць поезд са ст. Ушымі без дазволу і без жэзла на ст. Імяньпо.

31-га жніўня на ст. Яблоня японскі афіцэр бронепоезда № 501 нанёс два ўдары па твары дзяжурнаму па станцыі Скорыну, які патрабаваў прыкласці да заявы (аб адпраўцы поезда) накладныя. 15-га верасня на 1295 кілометры перагону Муданцзян—Мадаошы выкрыты пераходы тэлефонных правадоў праз палатно КУЧ, павешаных без узгаднення з дарогай японскімі вайсковымі чынамі на нова-ўстаноўленых імі слупах. Вышыня іх над галоўкай рэек — 6,3—6,9 метра — аказалася ніжэй устаноўленых на КУЧ правіл — 7,5 метра.

5-га кастрычніка японскія чыны прымусілі пад пагрозай зброі адправіць уночы на станцыю Іэтоухецзы дапаможны поезд са станцыі Хандаохецзы.

7-га кастрычніка японскія вайсковыя чыны на станцыі Шаньшы прымусілі сілай прычаніць да поезда № 52 платформу з пушкамі японскага камандавання, тоўш састаў поезда па вазе быў поўным і прычэпка не магла праводзіцца. 12 кастрычніка са станцыі Эрцзядцянцзы ў Харбін без дазволу і жэзла ўслед за поездам № 301 адправіўся бронепоезд № 501. Паравозам кіраваў ваенны машыніст.

20-га кастрычніка японскія вайсковыя чыны самавольна пусцілі бронедрэзіну насустрач поезду № 755, не гледзячы на папярэджанні і сігналы аб астанове. Дзякуючы таму, што стрэлкі былі настаўлены для прыёму поезда № 755, дрэзіна сышла з рэек. У выніку з не падзяючым поезд затрымаўся на дзве гадзіны 25 мін.

21-га кастрычніка без дазволу станцыі без жэзла і без кандуктарскай брыгады са станцыі Імяньпо ў бок Бэйшахо адправіўся бронепоезд № 501. 22-га кастрычніка са ст. Хайлін на ст. Муданцзян самавольна адправілася японская браневая дрэзіна з прычэпленай да яе вагонеткай з 15 японскімі вайсковымі чынамі. У результаце поезд № 501 быў затрыман на ноч на ст. Якуні. 23-га кастрычніка са ст. Муданцзян пад пагрозай зброі японскіх вайсковых чыноў адпраўлены без жэзла паязды № 1032 і 52.

На ст. Барым у раёне паласы адчужэння 13-га верасня на адлегласці 245 метраў ад восі галоўнага шляху арцелью рабочых пад кіраўніцтвам японца самавольна пачалася пабудова насыпу для шасейнай дарогі, якая ідзе паралельна палатну дарогі. Зямля для насыпу бяруцца на месцы, ад чаго ўтвараюцца рэзервы да 1-го метра глыбінёй. Падобныя-ж насыпы робяцца ў раёне паласы адчужэння на ст. Чжалантунь.

5-га верасня японскай будаўнічай арганізацыяй у паласе адчужэння ў раёне 2-х кілометра па Паўднёвай лініі КУЧ самавольна пачыстулена да пабудовы шасейнай дарогі ў напрамку горада Цунань.

19-га верасня на распараджэнню кіраўніцтва рачнога транспарта спынены работы па расчыстцы і рамонту 9-га прыстанскага шляху. У результаце руху на 13-му шляху са стрэлкамі № 7 і 19 быў закрыт. На перавалцы 8-га ўчастка службы шляху праз берагавы шлях на адлегласці 2-х метраў ля стрэлкі № 29 японцамі ўстаноўлены да берага Сунгары 2 рады праўляных стоек, закрыўшых першы і другі берагавы шлях для ўсякага руху.

10-га жніўня да палатна дарогі на 244 кілометры перагону Чжаромтэ—Якешы з'явіліся а кошмы фурманкамі прыватныя японцы і прыступілі да пагрузкі пяску з падешвы насыпу палатна дарогі для будаўнічых работ, якія праводзяцца японскім ваенным камандаваннем у пасёлку пры станцыі Чжаромтэ. 13-га жніўня японскімі вайсковымі чынамі для пераезду 188 кілометра на перагоне Хайлер-Хаке без згоды і ўведамлення адміністрацыі дарогі выкапаны ямы, пастаўлены тэлеграфныя слупы і падвешаны правады, праходзячыя праз чыгуначныя шляхі. Праводка праведзена без захавання тэхнічных правіл.

Тэрыторыя бліжка шубнапімакатнага завода КУЧ, якая належыць дарозе, у пачатку 1934 года гвалтоўным спосабам занята японскімі войскамі. 2-га лістапада начальнік японскай ваеннай місіі тэлефонаграмай на імя ўпраўляючага дарогай патрабаваў спынення работ на заводзе.

6-га лістапада ў 3 гадзіны 30 мін. японскі афіцэр і 3 салдаты падышлі да будынка пасажырскага вакзала ў горадзе Харбіне. Афіцэр застаўся ўнізе. Па сходніях, якія вядуць на дах, 8 салдаты ўзняліся і наўмысна пасвавалі электрычную праводку зробленай ілюмінацыі будынка вакзала ў звязку з кастрычніцкай гадавінай. З прычыны пасвавання праводкі больш паловы ілюмінацыі ва дзейнічала.

22-га кастрычніка на ст. Маоэрцзянь у поезд № 91 селі 6 безбілетных японскіх вайсковых чыноў. На прапанову амазчыка Якаўлева сыйсці з поезда яны нанеслі яму некалькі ўдараў па твары. 28-га кастрычніка на ст. Муданцзян японскімі вайсковымі чынамі самавольна прыступлена да капання ям і да ўстаноўкі тэлеграфных слупоў на ўчастках 3-й катэгорыі.

Указаныя выпадкі парушэння праў і інтарэсаў дарогі і служачых не носяць вычэрпваючага характару і прыведзены толькі ў якасці прыкладу. З прыведзеных прыкладаў ясна вілна карціна самавольства і самаўпраўства ў адносінах КУЧ і яе служачых. Звяртаючы ўвагу на паказаныя самаўпраўныя дзеянні і парушэнні дзейнічаючых правіл і ўмяшанне ў аператыўную работу дарогі японскіх вайсковых чыноў і служачых, я прашу прыняць саправудныя меры для аховы праў і інтарэсаў КУЧ і агентаў.

***

ХАБАРАЎСК, 25 лістапада (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна т. Бандура накіраваў Лі-Шао-гену 16 лістапада другое пісьмо. Тав. Бандура піша:

«У апошні час моў месца цэлы рад выпадкаў парушэння праў і інтарэсаў КУЧ і дзейнічаючых правіл з боку чыноў ахранных войск і паліцыі.

16 верасня на ст. Харбін у поезд № 3 селі 41 безбілетны вайсковы чын 28-га і 29-га палкоў ахранных войск і пагрузілі без дакументаў 16 скрынак снарадаў і 2 гранаты; давезлі гэты груз да ст Сіньцыцзін, дзе самі высадзіліся і выгрузілі без дакументы груз.

16-га кастрычніка на ст. Яомынь у поезд № 12 чынамі 3-й роты 13-га палка, 10-й брыгады, у вагон вайсковай аховы без правазных дакументаў пагружана 25 скрынак са снарадамі і 1 бамбамёт. У класныя вагоны селі 52 безбілетныя салдаты і 8 афіцэраў. Не гледзячы на заявы агентаў дарогі, што ў пасажырскіх паездах правоз выбухаючых рэчаў сурова забараняецца і можа пацягнуць няшчасныя выпадкі з пасажырамі, чыны ахранных войск у абодвух выпадках удаліць з вагонаў груз адмовіліся.

21-га кастрычніка камандаванне ахранных войск адправіла са ст. Малаошы на ст. Даймагоу ваенны поезд 14 512 без дазволу адміністрацыі станцыі і з парушэннем правіл тэхнічнай эксплуатацыі. Таксама было паступлена і на ст. Даймагоу, адправіўшы гэты поезд на ст. Мудзінь.

4-га кастрычніка на тэлеграфе ў Імяньпо па распараджэнню начальніка 4-га аддзялення чыгуначнай паліцыі самавольна ўстаноўлена цэнзура тэлеграфнай карэспандэнцыі.

Тэлефонных перагавораў. 5-га кастрычніка на тэлеграф на ст. Сочынцзы з'явіўся чын чыгуначнай паліцыі і зрабіў самавольна прагляд тэлеграфнай карэспандэнцыі, і з адной прыватнай тэлеграмы зняў копію. 30-га верасня на ст. Маляохэ, упакованыя і прадназначаныя да адпраўкі 6 коўдраў і 3 матрацы самавольна затрыманы чынамі чыгуначнай паліцыі і ўзяты на кватэру паліцэйскага Пенскага. Трэба адзначыць незаконамерныя дзеянні паліцыі пры перавозцы арыштантаў і іх канваіраў. Згодна дзейнічаючых на дарозе правіл, пакаазаных перавозкі павінны праводзіцца па спецыяльных патрабаваннях асобнага вагона або неабходнага ліку пасажырскіх месц у вагонах па заявах пракурорскага нагляду начальніку станцыі. У апошні час паліцыя і прыгранічны паліцэйскі атрад зусім не лічацца з устаноўленымі правіламі перавозкі арыштантаў, парушаючы пры гэтым матэрыяльныя інтарэсы дарогі.

23-га ліпеня 2 чыны чыгуначнай паліцыі суправаджаючы са ст. Пагранічная ў Харбін арыштаваных самавольна занялі 4-х месное купэ 3-га класа «ў плацкартным вагане поезда № 3, не аплацілі плацкарта і пярэчылі супроць скарыстання другімі пасажырамі астаўшыхся незанятымі месц у гэтым купэ. 18-га жніўня 8 чыноў чыгуначнай паліцыі, суправаджаючы 11 арыштаваных самавольна занялі ў поездзе № 3 з Пагранічнай да Харбіна пэлы вагон 3-га класа, пярэчачы супроць дапушчэння ў гэты вагон другіх пасажыраў у выніку чаго засталіся нескарыстанымі 30 месц. 1-га верасня для праезду 11 арыштаваных і 5 канваіраў у поездзе № 3 ст. Пагранічная ў Харбін самавольна занят цэлы вагон 3-га класа з недапушчэннем у яго другіх пасажыраў. У выніку ў гэтым вагоне засталіся нескарыстанымі 31 месца. 10-га верасня для праезду 15 арыштаваных і 15 канваіраў у поездзе № 3 са ст. Пагранічная ў Харбін самавольна занят адзін вагон 3-га класа з недапушчэннем у яго другіх пасажыраў. У результаце ў гэтым вагоне засталося нескарыстанымі 17 месц. 3-га кастрычніка для праезду 11 арыштаваных і 11 канваіраў у поездзе № 3 са ст. Пагранічнай у Харбін самавольна занят адзін вагон 3-га класа з недапушчэннем у яго другіх пасажыраў. У результаце ў гэтым вагоне засталося нескарыстана 26 месц.

10-га кастрычніка для праезду 7 арыштаваных і 8 канваіраў у поездзе № 3 са ст. Пагранічнай да Харбіна самавольна занят вагон 3-га класа з недапушчэннем у яго другіх пасажыраў. У результаце ў гэтым вагоне засталося нескарыстана 33 месцы.

У апошніх 5 выпадках канваіры не дапушчалі таксама прахаджэння праз занятыя вагоны агентаў паязной службы, парушаючы гэтым правільнасць абслугоўвання пасажырскіх паездоў.

Задачай ахранных войск з'яўляецца ахова КУЧ, не агентаў і іх праў і маемасці. Задачай паліцыі з'яўляецца ахова законнасці і парадку наогул, а чыгуначнай паліцыі — спецыяльная ахова КУЧ і дзейнічаючых на ёй правіл.

Між тым, з прыведзеных прыкладаў відаць, што як ахранныя войскі, так і паліцыя, у прыватнасці чыгуначная паліцыя, груба парушаюць правы і інтарэсы КУЧ і дзейнічаючыя на ёй правілы. Я лічу падобныя незаконныя дзеянні з боку органаў, закліканых ахоўваць і дапамагаць КУЧ і яе транспартнай дзейнасці, абсалютна недапушчальнымі і прашу прыняць меры да выяснення і пакарання вінаватых і знішчэння ў будучым падобнага роду дзеянняў, перашкаджаючых нармальнай рабоце дарогі».

Па Саюзу і Совецкай Беларусі

НАРКОМУ АБАРОНЫ СССР тав. К. Е. ВАРАШЫЛАВУ

Тэлеграма конюха Нікіт Месного

ПЕТРАПАЎЛАЎСК — АКМАЛІНСКІ, 27 лістапада (БЕЛТА). На днях удзельнік абласнога злёта ўдарнікаў жывёлагадоўкі конюх калгаса «Батрак», Сталінскага раёна, Нікіта Месны звярнуўся да наркома абароны Саюза ССР тав. Варашылава з наступнай тэлеграмай.

«Масква, Крэмль, Варашылаву.

Мне 70 год. Я працую конюхам у калгасе «Батрак», Карагандзінскай вобласці. Многа я вырасціў добрых коней, прэміравалі мяне за ўдарную работу. Начальнік палітаддзела Ельтайскай МТС водзіць са мною шчасную дружбу. За апошні час вырасціў я такога каня, які, па-мойму, не горшы за вашага рысака: рослы, гуллівы, быстраходны. Конь — у любую мінуту гатоў да абароны. Навучылі мы каня скакаць праз бар'еры, канавы, конь на сігналу ложыцца і ўстае.

На аднадушнай волі калгаснікаў рашылі мы падарыць гэтага каня Вам, дарагі наш Клімэнцій Ефрэмавіч Варашылаў. Прымі наш падарунак у фонд абароны радзімы і загадай, як і куды перадаць каня.

Член калгаса «Батрак», Сталінскага раёна, НІКІТА МЕСНЫ».

СТАРШЫНІ ЦВК СССР тав. КАЛІНІНУ М. І., СТАРШЫНІ СНК СССР— тав. МОЛАТАВУ В. М.

Прынёсшу глыбокую падзяку за аказаны мне высокі гонар — узнагароджанне ордэнам Леніна.

Гэта найвышэйшая ўзнагарода з боку дзяржавы пролетарскай дыктатуры для мяне даражэй за ўсё.

Я шчаслівы быць сынам вялікай, дарагой социялістычнай радзімы і мець магчымасць аддаць усе свае сілы і веды на социялістычную перабудову і ўзмацненне нашай, самай буйнай у свеце сельскай гаспадаркі.

Ваш В. Р. БІЛЬЯМС.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПА СПЛАВУ

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу).

25 лістапада ў Бабруйску з удзелам прадстаўнікоў цэнтральных партыйных і профсаюзных арганізацый адкрылася ўсебеларуская нарада па сплаву. БССР пад правільным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б першай у Саюзе пасяхова выканала сплаўныя работы — 108 проц. плана. Гэтаму ў значнай ступені спрыяла арганізацыя інстытута парторгаў.

На першым пасяджэнні выступіў кіраўнік Леобела тав. Шэпіра. Лепшы парторг сплаву тав. Вензель расказаў аб вопыце работы парторгаў на сплаўных участках Бярэзіна-Дняпроўскага басейна.

ФЕЙГІН.

КАЛГАСНЫЯ УНІВЕРМАГІ

У Барысаве, Бабруйску, Полацку і Рэчыцы заканчваецца пабудова новых калгасных універмагаў спажывецкай кааперацыі. На будаўніцтва іх адпушчана 200 тыс. руб.

К 1-му студзеня 1935 г. магазіны будуць адкрыты.

НОВЫ КОКНЫ ЗАВОД

У Магілеўскім раёне арганізаван трэці ў Беларусі конны завод «Дай каўка». Завод разлічан на 165 галоў, з якіх 50 матак, 112 шт. маладняка і 3 жарабцы.

АДНАЗТ. К. Е. ВАРАШЫЛАВА

Ельтайская МТС, Сталінскага раёна, Карагандзінскай вобласці. Конюху калгаса „Батрак“ тав. Нікіце Месному

Дарагі таварыш, вялікае сяброўскае Вам дзякуй за тэлеграму і за добры Ваш падарунак. Кана, як дар калгаснікаў праз мяне Чырвонай арміі, скарыстаем для абароны дарагой нашай радзімы.

Веру, тав. Месны, што вырашчаны Вамі калгасны конь не горш за тых, на якіх аджду я і нашы камандзіры, і радуюся гэтаму блямерна. Прадаўжайце Вашу чэсную ўдарную работу па вырошчванню совецкіх добрых коней — яны сваёй работай дастойна адплацяць нам на калгасных палях, а пры неабходнасці — і на палях бітэ. Прывітэнне Вам, тав. Месны і ўсім калгаснікам вашага калгаса.

К. ВАРАШЫЛАЎ.
26 лістапада 1934 г.

ДАСЯГНЕННІ МАШЫНАБУДАЎНІЦТВА БССР

За апошнія месяцы гэтага года машынабудаўніцтва БССР дабілася значных поспехаў, асабліва ў галіне асваення вытворчасці новых тыпаў варштатаў. Напрыклад, завод «Комунар» (Менск) асвоіў за гэты час вытворчасць цэнтравальнага аднашвідальнага варштата сістэмы «Гелера», нажовачнага варштата тыпу «Орыон-Гаккэ», працяжнага варштата тыпу «Дальц»; завод імя Варашылава (Менск) асвоіў вытворчасць торфкамбайна (багер) і дрэвабрыкетнага пресы; гомельскі завод «Пролетарый» упершыню ў СССР асвоіў выпуск паліровачнага і каліброванага варштата сістэмы «Калава»; віцебскі завод «Чырвоны металіст» — рэзьбанарэзнага варштата тыпу «Тіль» і інш.

ПОМНІК ЛЕНІНУ У СЛУЦКУ

СЛУЦК, 25. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Работнікі асветы на справаздачным сходзе вынеслі пастанову арганізаваць збор сродкаў на пабудову ў Слуцку помніка Леніну.

Ініцыятыва членаў саюза працаветы падхоплена школьнікамі, прадпрыемствамі і ўстановамі горада і раёна.

АНЭТ.

ГАДАВЫ ПЛАН ВЫКАНАН

РЭЧЫЦА, 27. (Па тэлеграфу).

Рэчыцкая запалкавая фабрыка «Х Кастрычніка» выканала гадавую праграму 26 кастрычніка на 100 проц.

ЗУБРЫЦКІ, МАРЧАК, ФІНКЕЛЬБЕРГ.

ГУКАВОЕ КІНО І РАДЫЁ У ГАРАДЗІ

(Ад карэспандэнта «Звязды»).

Да адкрыцця раённага з'езда совецтаў у Гарадзе пераабсталёўваецца кіно-тэатр; устанаўляецца гукавы апарат.

Адначасова пачне працаваць радыё-вузел.

ПА УСЕЙ БССР ВЫПАЎ СНЕГ

26 лістапада па ўсёй БССР выпаў снег, 27 лістапада снег выпаў у паўночнай і паўночна-заходняй частцы БССР. На поўдні назіраліся туманы. Тэмпература ў Менску мінус 5 градусаў.

З 28 лістапада чакаецца пахалоданне, якое працягнецца да 1-га снежня. Тэмпература будзе ніжэй 3-5 градусаў.

(БЕЛТА).

4 снежня 1934 года ЦК КП(б)Б і СНК БССР праводзяць рэспубліканскую нараду па пытаннях перавыбараў совецтаў, дрэвазагатовак, ільнозагатовак і закупкі хлеба.

Ля мікрафона будуць заслуханы даклады раённага кіраўніцтва па гэтых пытаннях.

Радыё-пераклічкай кіруюць сакратар ЦК КП(б)Б тав. Валковіч і нам старшыні СНК БССР тав. Саак'ян.

Радыё-пераклічка пачынаецца роўна ў 9 гадзін вечара. К гэтаму часу ва ўсіх раёнах павінны з'явіцца на пераклічку: сакратар РК КП(б)Б, сакратар РК ЛКСМБ, старшыня РВК, дырэктар лесгаса, начальнікі ўчасткаў, загадчык канторы «Заготлёна», старшыня райсаюза.

У Менску на пераклічцы абавязкова прысутнасць тт. Гвоздзецкага, Розіна, Баскіна, Нольдэ, Вайновіча.

Пераклічка праводзіцца з радыёстудыі Дома ўрада.

ЦК КП(б)Б.
СНК БССР.



Рабочыя завода «Кінатэхніка» праходзяць тэхнічную вучобу ў новым добра абсталяваным габінеце.

ЛЕПШЫМІ ЛЮДЗЬМІ НАШАЙ КРАІНЫ УМАЦУЕМ СОВЕТЫ —БАЯВЫЯ ОРГАНЫ ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

ВЫБІРАЕ ЧЫРВОНАСЦЯЖНЫ „ОКЦЯБР"

Клуб шкіпнай фабрыкі «Окцябр» перасціць чырвонымі касынкамі, зялёнымі беретамі, юнымі халатамі, матарыстак, закройчыкаў, мадэлістак. 903 рабочыя і работніцы сабраліся на выбарчы сход.

Уважліва слухае прыгатаваны зрэдыторыя новы склад горсовету. Шэс разделаў: «Жыллёвае будаўніцтва». Дзесяткі заявак — узмацніць кіраўніцтва жаўтамі, выпусціць жыллёвую пазыку, пабудаваць рабочыя дачы.

І так пра культуру, ахову здароўя, харч, таварааборот. У кожнага свае патрабаванні.

Тварцы соцыялістычных будняў, энтузіясты высокіх тэмпаў, змагары — фізічнае шырокае жыццё — клубы, ці аб падручніках для вучняў, і аб пляцовае вялікага тэатра, і аб дзіцячай літаратуры і калгасным санаторыі.

Яны хочуць пішаціраваць на шырокіх праспектах, па чыстых асфальтаваных вуліцах. Яны хочуць скакаць з парашутных вышак. Яны хочуць адпачываць у культурным парку, захапляцца прыгожай музыкай.

І Адпагалосна зацвярджаецца наказ. Прыступаюць да выбараў.

Пад бурныя і незмаўкаемыя апладысменты першымі дэпутатамі ў горсовет выбіраюцца: сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гікало**, старшыня Соўнаркома БССР тав. **Галадзед**, старшыня ЦОПСБ тав. **Кавальчук**, загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. **Кенік**, работнік Менгаркома тав. **Эпштэйн**, сакратар парткома тав. **Канонік**, былы дамскі краўец — дырэктар фабрыкі т. **Драгілёў**, лепшы ўдарнік і ўдарніца, старыя рабочыя фабрыкі. **Карэльская** — работніца, вытворны стаж 22 гады, парторг, актыўная рабкорка; **Файгенбаўм** — старая работніца, беспартыйная. Была актыўным дэпутатам у старым складзе горсовета; **Ганчаронак** — выдатніца, зотаўка; **Голуб** — добры грамадскі працаўнік, удзельнік групы масавага работчага кантроля; **Карналеўская, Пецельская, Еўсюціна.**

У кандыдаты выбіраюцца: **Зільперын** кавалер, пам. начальніка поха **Ігэльчык**, закройчык **Пелеўскі**, рабочыя — **Шпітальнік і Агароднікава.**

Пад бурныя апладысменты і гучныя «ура», у ганаровыя члены горсовета выбіраецца правадыр сусветнага пролетарыята — тав. **СТАЛІН.**

Т.

СІ-СУ-ДЗІ старшыня кітайскага нацыянальнага калгаса імя «Кантонская комуна» выбран членам Нікалаеўскага сельсовета, Віцебскага раёна.

У СОВЕТЫ—ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ!

ВІЦЕБСК. У большасці сельсветаў раёна ў члены советаў выбіраюцца лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, актыўныя селькоры калгаснай вёскі.

На выбарчым пункце калгасаў «Перамога» і імя Кантонскай комуны ў члены Нікалаеўскага совета аднагалосна выбран старшыня кітайскага нацыянальнага калгаса Сі Су-дзі.

Сі Су-дзі не раз выбіраўся дэлегатам на раённы і ўсебеларускі злёты калгаснікаў-ударнікаў. Як актыўны селькор, ён прымаў удзел у святкаванні юбілею «Крестьянской газеты» ў Маскве, у якасці госця ён прысутнічаў на XVII партыйным з'ездзе. Членам сельсовета Сі Су-дзі з'яўляецца ўжо тры гады.

Ад польскага нацыянальнага калгаса імя Мархлеўскага ў члены Рудніцкага сельсовета аднадушна выбран калгаснік-ударнік **Бельскі.** Бельскі вядомы ў раёне як адзін з актыўнейшых селькораў і добры грамадскі работнік.

Калгас «Іскра». Віцебскага сельсовета, паслаў ў дэпутаты калгасніка латыша Упіт Андрэя. Не гледзячы на сваю старасць — 85 гадоў — Упіт, будучы нясныпна 10 год членам Віцебскага совета, прымаў самы актыўны ўдзел у яго рабоце, асабліва па арганізацыйна - гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Упіт — былы чырвоны партызан, член партыі з 1917 года.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ і В. РЫЖЫ.

ДАКЛАДЧЫК НЕ З'ЯВІУСЯ

Каля 300 работнікаў юстыцыі, навуковых супрацоўнікаў Даследчага інстытута і судовай экспертызы і членаў калегіі абаронаў к 4 гадзінам вечара запоўнілі вялікую залу Наркамюста.

Яўка своечасовая і поўная. Сход, аднак, не пачынаецца. Праходзіць у чаканні поўгадзіны... гадзіна. Па залу пашлі ўпартыя чуткі:

— Яшчэ не прыйшоў дакладчык.

Што-ж, бывае. Треба пачакаць яшчэ крыху. Чакаюць. Праходзіць яшчэ гадзіна. Дакладчыка ўсё няма.

Сход хвалюецца. З'яўленне ў зале кожнага новага чалавека сустракаюць прапізваючыя погляды некалькіх сот вачай, каб пазнаць ва ўвайшоўшым дакладчыка. Дарэмна. Дакладчыка не было.

Праз 2½ гадзіны старшыня мясцкома Наркамюста звоніць у гарадскую выбартую камісію і паведамляе, што дакладчык тав. Валодзька не з'явіўся.

Дарэмнымі былі ўгаворы тав. Валодзька Жуковічам. Нічога не дапамагло. Валодзька не палічыў патрэбным з'явіцца на сход. Прыцлося, як кажуць, у «пажарным парадку» падшукаць другога дакладчыка.

Мы лічым, што падобнага роду парушэння совецкай дысцыпліны з боку тав. Валодзька павінна стаць прадметам абгаварэння партыйнымі органамі.

ГОЛАС ЧЫГУНАЧНІКАЎ

Чыгуначнікаў нельга сабраць у адзін дзень. Калі адна частка знаходзіцца тут на месцы, другая—у дарозе: на Маскву, на Далёкі Ўсход, на Харкаў, Ленінград. Таму і справаздачныя і выбарчыя сходы рабочых **менскага вагоннага** дэпо і службы спальных вагонаў праводзяцца на працягу некалькіх дзён.

З выключнай актыўнасцю абгаварваецца наказ. Яшчэ задоўга да перавыбараў у цэхах былі адкрыты кнігі для запісу прапаноў у наказ новаму горсовету. У гэтых кнігі рабочыя ўпісалі 180 каштоўных прапаноў.

Зараз на сходах вагонпічыкі ўзбагачаюць кожны раздзел наказу яснымі дадаткамі.

— Пабудаваць на ст. Менск прыгарадны вакзал і пляцоўкі для прыгарадных паездоў на станцыях Менскага раёна.

— Горсовет павінен абавязаць клієнтуру пабудаваць эстакаду для разгрузкі вугалю і торфу.

— Пракласці кругавую трамвайную лінію па Койданаўскаму тракту, міма аэрадрома, да Козырава.

— Забрукаваць вуліцу Бухарына, Магілеўскую вуліцу і ўсе вуліцы вакол вакзала.

— Заасфальтаваць Плац Волі.

— Пабудаваць у горадзе ўборны клозет.

— Кіно на Серабранцы.

— Зімовы басейн для плавання.

— Пабудаваць зоапарк; крематорый;

— Пабудаваць тэатр для дзяцей; гарадскі цір; парашутную вышку.

Каля 80 дадаткаў унесена ў наказ на сходах 25 і 26 лістапада.

З такой-жа ўвагай, як абмаркоўвалі наказ, абгаварвалася кожная кандыдатура новага дэпутата горсовета.

Тав. **МІШЧУК**,—лепшы ўдарнік-брыгадзір па рамонту вагонаў. Яго добра ведаюць усе выбаршчыкі. Аднагалосна праводзіцца ён у дэпутаты горсовета.

АНТАНІНА ПРАЛІЧ—слесар інструментальшчык, ударніца сталінскага прызыву, член ЦВК БССР.

Ці ёсць адводы?—запытвае ўпаўнаважаны гарадской выбарчай камісіі тав. **Кузняцоў.**

Дружнымі апладысментамі адказалі выбаршчыкі на гэта запытанне.

ВУЛЬСКІ—змачык, з 30-гадовым вытворчым стажам. **БЕКЕР**—малады выбаршчык, лепшы комсамолец-ударнік. **ФАНЯ ЛІУШЫЦ**—комсамолка-ударніца, электрамантёр. **БРЫДЗІХІН**—упаўнаважаны НКВД па Менскаму вузлу. Тав. **ПЕКАРЗВІЧ**, старшыня мясцкома 6-га вагоннага ўчастка. **КАДОЛКА**—лепшы ўдарнік, брыгадзір па рамонту вагонаў.—Вось каго паслалі рабочыя вагоннага дэпо і службы спальных вагонаў сваімі дэпутатамі ў горсовет.

Кандыдатамі ў члены горсовета выбраны тт. **АРШЫНАЎ, ФРЫДРЫХ, ОЛЯ ЛАМАКА**—лепшыя ўдарнікі вытворчасці.

Пад бурныя воплескі і дружныя крыкі «ўра» выбраны ў гарадскі совет сакратары ЦК КП(б)Б т. **ГІКАЛО** і т. **ВАЛКОВІЧ**, загадчык прамыслова-транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. **ГОТФРЫД** і нам. старшыні СНК БССР т. **СААК'ЯН.**

Доўга незмаўкаемымі апладысментамі сустрэлі чыгуначнікі прапанову выбраць ганаровымі членамі Менгорсовета таварыша **СТАЛІНА**, т. **ВАРАШЫЛАВА** і наркома шляхоў зносін т. **АНДРЗЕВА.**

С. Г.

ЗА ЛЁН, ЗДАНЫ ЗВЫШ ПЛАНА КАЛГАСАМ, АТРЫМЛІВАЮЦЬ НА 50 ПРОЦ. БОЛЬШ ХЛЕБА

Арганізацыя дапамогі адстаючым калгасам, перавыкананне плана перадавымі і бязлітасная барацьба са спекулянтамі ільном—вось што рашае зараз паспяховае завяршэнне ільнозагатовак

КАЛГАСЫ ЗДАЮЦЬ ЛЁН ЗВЫШ ПЛАНА

СЛУЦАК. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Лучнікоўскі сельсовет па ільнозагатоўках займае першае месца ў раёне. План выканан на 103 проц. Сельсовет заваяваў першынства ў барацьбе за лён тэму, што кіраўнікі яго не сядзелі ў канцылярыі, а ўвесь час знаходзіліся ў калгасах і вёсках і там на месцы ў брыгадах, на таках арганізоўвалі перапрацоўку і здачу ільновалакна высокай якасці.

Лучнікоўскія калгаснікі рэгулярна перавыконвалі нормы трапання, бо ўлічыліся, што за выкананне дзённай нормы ў іх працоўныя кніжкі запісваюць па 2 поўнацэнныя працадні.

Выканаўшы план ільнозагатовак, кіраўнікі Лучнікоўскага сельсовета ўсё-ж не супакоіліся. У калгасах завяз разгорнута масава-растлумачальная работа за перавыкананне плана. Калгаснікам растлумачылі, што за валакно, зданае звыш плана, яны атрымліваюць на 50 проц. больш хлеба. У рэзультаце — калгас імя Молатава ўжо здаў звыш плана 3 цэнтн. ільновалакна. Рыхтуюць валакно звыш плана і іншыя калгасы сельсовета.

Калгас імя Леніна, Леніншкага сельсовета, павінен быў здаць 4 тоны ільновалакна. Калі калгас выканаў план, здаўшы валакно 10 і 12 нумарам, атрымаў 5 тон хлеба і разморкаваў яго на ільняных працадні, калгаснікі раны здаць 400 кг. ільну звыш плана.

АНЕТ.

ЧАМУ ЧЭРЫКАЎШЧЫНА ЗРЫВАЕ ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ

ЧЭРЫКАЎ, 25. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

З пяцідзённі ў пяцідзённку Чэрыкаўскі раён недапушчальна знижае тэмпы ільнозагатовак. З другога месца ў рэспубліцы ў першы час загатовак раён на 20 лістапада скаціўся на 58 месца.

Пастановай рэспубліканскай камісіі на спаборніцтву з Заходняй вобласцю Чэрыкаўскі раён паперэджан, што ён будзе занесен на чорную дошку.

За 25 дзён лістапада раён загатовіў толькі 15 проц. ільнопрадукцыі. Гадавы план выкананы толькі на 75 проц. У чым прычыны такога становішча?

Перш за ўсё ў раёне не арганізавана дапамога адстаючым калгасам. 60 калгасаў скончылі загатоўкі. Аднак, такая-ж прыблізна колькасць калгасаў план не выканалі. У раёне да гэтага часу не практыкуюць пасылкі брыгад вопытных ільнаводаў перадавых калгасаў у адстаючыя для перадачы вопыту іх барацьбы за лён.

Возьмем, напрыклад, Шароеўскі сельсовет, які выканаў свой план ільнозагатовак на 67 проц. У гэтым сельсавеце ёсць калгас «Юны аратый», які свой план ільнозагатовак перавыканаў яшчэ месяц таму назад. Аднак, старшыня сельсовета тав. Астапенка не дадумаўся да таго, каб арганізаваць дапамогу суседняму адстаючаму калгасу «Чырвоны Окцябр», які знаходзіцца за поўкілометра ад «Юнага аратага» і выканаў свой план менш чым на 50 проц.

Такое становішча літаральна ў кожным сельсавеце і ў гэтым перш за ўсё прычыны ганебнага ходу загатовак.

Наступная прычынай адставанля раёна з'яўляецца адсутнасць якой-небудзь дапамогі аднаасобнікам у арганізацыі перапрацоўкі валакна і патуранне сабатажнікам загатовак.

За восень у калгасы Чэрыкаўшчыны ўступіла да 500 аднаасобнікаў. Ні ў адным калгасе раёна не арганізавана дапамога нова-ўступіўшым калгаснікам у перапрацоўцы валакна, якое з іх належыць здаваць па кантрактацыйнаму дагавору.

Вось у калгасе «Чырвоны араты». Зябеньскага сельсовета, нова-ўступіўшы калгаснік Мароза? больш тыдня просіць кані, каб на прывадной мялцы памяць свой лён. Адказ старшыні калгаса Райкова быў больш чым кароткі:

— Мы дзе хочам.

У радзе сельсоветаў не змагаюцца з сабатажнікамі ільнозагатовак, са спекулянтамі. Так, аднаасобнік горсовета Нікалаеў Захар дзяржаве не здаў ні фунта ільну, а 25 лістапада на рынку прадаў 48 кг. валакна. Не дзіва, чаму па горсовету аднаасобнікі не здалі дзяржаве ні аднаго кілограма ільну. Адкрыта спекулююць ільном аднаасобнікі Лабанаўскага, Зябенскага і Расіцкага сельсветаў.

Вось чаму, калі калгасы раёна план загатовак ільну выканалі на 88 проц., то аднаасобнікі злалі дзяржаве менш 1/3 свайго плана — 23 проц.

ФОНКАЦ.

З КАЛГАСАЎ І ІЛЬНОЗАВОДАЎ

(З ПІСЕМ КАЛГАСНІКАЎ)

У калгасе «Новае жыццё», Плоскага сельсовета (Талачынскі раён), як паведамляе калгаснік Якубовіч, на ільнозагатоўку зусім не звярнулі ўвагі. Яшчэ да гэтага часу на апрацоўку не пераключана рабочая сіла, хоць большасць калгаснікаў зусім свабодны ад работы ў калгасе.

У калгасе змяты лён валяецца пад навесамі.

Працоўная дысцыпліна ў калгасе зусім дрэнная. Калгаснікі выходзяць на работу толькі ў 11-12 гадзін. У выніку калгас яшчэ амаль зусім не пачаў здаваць ільнопрадукцыю дзяржаве.

Раённыя арганізацыі не дапамагаюць адстаючаму калгасу «Новае жыццё».

Вялікую работу на апрацоўцы і здачы ільнопрадукцыі дзяржаве правялі селькоры Горскага сельсовета, **Горацкага раёна.** Селькор Н. Фесін паведамляе, што селькорамі быў арганізаван чырвоны абоз з ільновалакном. Абоз суправаджалі селькоры перадавога калгаса «Чырвоны сцяг». Было здадзена 22 центн. валакна 12 і 14-м нумарам.

Селькоры калгаса «Шлях да соцыялізма» арганізавалі сігнальныя пасты на сушыльна-мяльных пунктах.

Лепельскі ільнозавод № 12 увесь час знаходзіцца ў велізарным прарыве. Рабочы гэтага завода Фальванаў піша, што больш 50 проц. часу завод прастойвае. Завод не забяспечан работамі. Тым не менш цякучасць рабочай сілы недапушчальная.

Пісьмы

МЕНГОРПРАКУРОРУ тав. ГІНЗБУРГУ.

КАЛІ-Ж СКОНЧАЦЦА ГЭТЫЯ МЫТАРСТВЫ?

(ПІСЬМО РАБОЧАГА-ЎДАРНІКА)

Ужо 5 год я працую на менскай абутковай фабрыцы імя Кагановіча. Выконваю шмат грамадскіх нагрузак. За добрую работу нескальк разы прэміраваўся.

Пакойчык мой па Старо-Віленскай вуліцы, д. № 20, кв. 2, зусім непрыгодны для жылля, — сыры, цёмны. Ад гэтага хварэла маё дзіця. Пакой да таго малы, што нельга дзве паставіць ложка, рэчаў. Жонка з малым дзіцём з-за гэтага начуе ў суседзей і знаёмых.

З 1933 года штодзённа хаджу ў жакт № 33, патрабую прадаставіць мне другую кватэру, і ўсё даремна. У верасні гарпракурору на маёй заяве напісаў: «З прычыны дрэнных кватэрных умоў прадаставіць тав. Поляку другую кватэру». Даваў некалькі распараджэнняў жакту і гаршыкаюз. Але з гэтага і пасёнешні дзень нічога не вышла.

ПОЛЯК.

САКРАТАРУ ПАРЫЦКАГА РК КП(б)Б тав. КЕРЖАНЕВІЧУ

СЕЛЬСОВЕТЧЫКІ ПРЫСВОЙВАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

З 1931 па 1933 год я працаваў у Ламавіцкім сельсавеце (Парыцкі раён). Мною было выплачана пазыкі трэцяга рашаючага і 4 завяршаючага года пяцігодкі на 170 руб.

Аблігацый і да гэтага часу не выдалі. Некалькі раз звярачаўся я ў райфа і РК саюза працаўнікоў; таксама пісаў у райгазету. І не гледзячы на ўсё гэта, аблігацый яшчэ не атрымаў.

В. А. ГАРБАЧЭЎСКІ.

АД РЭДАКЦІІ. Ян відаць з пісьма тав. Гарбачэўскага, парыцкія раённыя арганізацыі не ўлічылі шматлікіх сігналаў «Звязды» аб злачынкай затрымцы ў выдачы аблігацый падпісчыкам.

Гэты факт гаворыць аб тым, што ў Парычах абслугоўваннем пазыкатрымальніка не займаюцца.

«Звязда» чакае, што Парыцкі РК КП(б)Б зробіць з гэтага самыя сур'ёзныя вывады, і вапакітчыкаў, бюракратаў, невыдаючых аблігацый падпісчыкам, прыцягне да суровай адказнасці.

САКРАТАРУ СМАЛЯВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. КУДМАНУ

НЯМА УМОЎ ДЛЯ ЗАНЯТКАЎ

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА).

У **саратаўскай** пяцюўнай сярэдняй школе (Смалявіцкі раён) няма ўмоў для нармальных заняткаў.

Тры класных пакоі знаходзяцца ў двух будынках, у якіх падвойных рам няма, таксама няма пячных юшак і дзвярэй. Апалам школа не забяспечана. Заняткі другой змены з-за адсутнасці газы сістэматычна зрываюцца.

Дырэктар школы Кудлач занаўся будаўніцтвам яшчэ аднаго дома для школы, а ўпарадкаваннем старога школьнага будынка не займаецца.

Старшыня сельсовета Якімовіч не аказвае школе пішкай дапамогі. Ведае аб становішчы школы і загадчык райана тав. Абраменка.

ДЗЕМЯНОВІЧ.

РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ ПОЛАЦКАГА РК КП(б)Б тав. ТУРЛАЮ

ЯК-ЖА АТРЫМАЦЬ ГРОШЫ?

(ПІСЬМО ДЭМАБІЛІЗАВАНАГА ЧЫРВОНААРМЕЙЦА).

Пасля дэмабілізацыі з рады Чырвонай арміі я быў накіраваны Полацкім РК КП(б)Б на работу намеснікам старшыні райсовета Асоавіяхіма. На гэтай работе я прапрацаваў два з паловай месяцы і грошы за работу не атрымаў і па цяперашні час.

Не раз звяртаўся у РК КП(б)Б, да пракурора, але бескарысна.

ЦЫМБАЛАЎ.

У Пачэпаўскім сельсавеце Чырвонапольскага раёна на працягу 5 год будуецца школа. Ніяк скончыць не не могуць. Ніхто не сочыць за ходам будаўніцтва. Наступіла зіма, а дом для школы яшчэ не скончан.

КУКІН.

— СКАЖЫ-КА, ДЗЕ ТУТ НОВАЯ ШКОЛА?

— А ВОСЬ ТУТ ПАВІННА БЫЛА БЫЦЬ. ДА СНЕГАМ ЗАСЫПАЛА.

Па слядах пісем

„БЯЗДУШНЫЯ АДНОСІНЫ ДА НАСТАЎНІКАЎ"

На змешчанае ў «Звязде» ад 2 кастрычніка № 220 пісьмо «Бяздушныя адносіны да настаўнікаў» Жлобінскі РК КП(б)Б паведамляе, што факты **пацвердзіліся.**

РК абавязаў райсаб і райсаюзыўсаюз выдаваць пайкі настаўнікам не пазней 1 числа кожнага месяца па гораду, і 5-га—па вёсцы. На вінаўных за зрыў снабжэння настаўнікаў райпракуратурай заведзена крымінальная справа.

Горсовету і горвыканкому на працягу месяца прапанавана забяспечыць настаўнікаў кватэрамі.

РВК і горсовету прапанавана на працягу двух дзён выдаць настаўнікам зарплату за верасень.

„ДЫРЭКТАР ЗВЯРОВІЧ ЗАЙМАЕЦЦА ШКОДНІЦТВАМ"

Пад такім загалоўкам было змешчана пісьмо тт. Апаровіча і Балевіча (гл. «Звязду» № 136 ад 23 чэрвеня г.г.).

Яны пісалі, што дырэктар саўгаса «Залог пяцігодкі», Суцінскага сельсовета (Пухавіцкі раён) Звяровіч па-шкодніцку кіруе саўгасам, у рэзультаце чаго здохла 29 коней, згноена больш 500 і прарасло каля 100 пудоў жыта і т.д.

Пухавіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты, прыведзеныя ў пісьме, **пацвердзіліся.**

Дырэктар саўгаса **Звяровіч з работы знят і асуджан на тры гады пазбаўлення волі.** Партарг **Балевіч** знят з работы і **выключан з партыі.** Старшыні рабкома **Абрасімовічу** абвешчана **суровая вымова.**

А. ХАЦКЕВІЧ ◆ Народны камісар фінансаў БССР

Заваяваць пяршынства

На ўсебеларускай фінансавай нарадзе прадстаўнікі раёнаў запоўнілі ЦК КП(б)Б, Соўнарком і Наркамфін Саюза аб добраякасным, датэрміновым выкананні фінплана бягучага года. Аднак, у большасці раёнаў гэтыя запоўненні рэзка разыходзяцца са справамі. Апошняя нарада не толькі не выклікала рашучага пералому ў выкананні плана мабілізацыі сродкаў у першых кварталах, не ўступаюць гэтых месц і зараз. На 20 лістапада Чашніцкі раён выканаў заданне на 75 проц., а Менскі раён ужо скончыў выкананне ўсяго гадавога плана.

Чакуль што, аднак, гэта адзінкі. Большасць-жа раёнаў адстае. Асабліва недапушчальна правальваюць фінплан **Веткаўскі, Полацкі, Рагачоўскі, Быхаўскі, Асіпавіцкі, Гарадоцкі, Бабруйскі, Талачынскі, Горацкі, Дубровенскі, Петрыкаўскі і Бярэзінскі раёны.**

Чым можна вытлумачыць, як не спартуністычнай самасупакоенасцю ў рабоце гэтых раёнаў і асабліва Бярэзінскім, які на 20 лістапада здолеў выканаць заданне толькі на 24,5 проц. На якія асаблівыя ўмовы могуць указаць Ельскі, Клімавіцкі, Горацкі, Асіпавіцкі, Талачынскі, Бабруйскі, Бярэзінскі раёны, адстаючыя па аднаразовому падатку. Якімі асаблівымі ўмовамі будзе матываваць Чавускі раён амаль поўны правал выканання задання па страхоўцы, у той час, як Чашніцкі раён выканаў гэта задан не на 93,3 проц.

Што могуць сказаць калгаснікі і калгаснікі Талачынскага, Расонскага, Нараўлянскага, Веткаўскага, Гарадоцкага раёнаў аб рабоце раённых арганізацый, якія не забяспечылі своечасовага паступлення грошай па калгаснай падпісцы, у той час, як калгаснікі Чашніцкага, Менскага і інш. раёнаў даўно поўнасцю аплацілі сваю падпіску.

Раённыя арганізацыі і ў першую чаргу фінорганы адстаючых раёнаў, відаць, не разумеюць таго, што чацверты квартал з'яўляецца рашаючым у выкананні ўсяго гадавога плана. Адгэтуль яны самазадаволена, «калі мы ў трэцім квартале выканалі план, дык у чацвертым для нас выканаць яго глупства».

Гэта небольшэвіцкая самасупакоенасць з'яўляецца асноўнай прозай, што фінплан не будзе выкананы. Яна не дае магчымасці ўсёй БССР права рапартаваць з'ездам советаў і старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР тав. **Молатаву** аб датэрміновым выкананні фінплана, за што змагаюцца арганізацыі і актыў перадавых раёнаў.

Для дапамогі адстаючым раёнам Наркамфін паслаў у якасці ўпаўнаважаных звыш 30 чалавек. Аднак, што могуць зрабіць гэтыя ўпаўнаважаныя пры нездавальняючых адносінах да выканання фінплана, цалага раду раённых кіруючых органаў.

Кіраўніцтва Бабруйскага раёна, напрыклад, заяўляе: «Раней правялем перавыбары советаў, выкажаем ільнозагатоўкі, а потым возьмемся за фінансы». Добра, калі гэты раён закончыць ільнозагатоўкі праз 2-3 дні, а калі гэта справа затрымецца на дэкаду-паўтары, правал фінплана будзе забяспечан самім раённым кіраўніцтвам.

З Петрыкоўскага раёна ўпаўнаважаны тэлеграфуе: «Старшыня РВК слаба дапамагае ў мабілізацыі сродкаў. Загадчык райфа замацаван за адным сельсоветам. Старшыня РВК не дазваляе яму выезд у Петрыкаў для ліквідацыі прарыву па фінплану».

Тут мы маем грубейшыя парушэнні дырэктыў партыі і ўрада пра выкананне плана мабілізацыі сродкаў і скарыстанне на гэтай падставе фінансовых работнікаў.

Для таго, каб сапраўды на справе па-большэвіцку выканаць план мабілізацыі сродкаў па ўсіх плацяжах да 15 снежня, як гэтага патрабуюць партыя і ўрад, адстаючыя раёны абавязаны зараз-жа ўзяцца за ліквідацыю прарыву, не спасылацца на перавыбары советаў і ільнозагатоўкі, як перашкаджаючыя ў выкананні фінплана, а наадварот гэтым мерапрыемствы скарыстаць для забеспячэння добраякаснага і датэрміновага выканання фінплана.

Раённае кіраўніцтва кожнага з адстаючых раёнаў абавязана ўзмацніць работу райфа, райшчадкасы, усіх фінансава-кредытных органаў, устанавіць кантроль за правядзеннем імі класавай падатковай палітыкі і забяспечыць выкананне планаў па добраахвотных плацяжах.

Неабходна зараз-жа ўзяцца за выкананне дырэктывы ЦК КП(б)Б, якая катэгарычна абавязвае райкомы КП(б)Б забяспечыць поўнае спагнанне аднаразовага падатку з аднаасобных гаспадарак і страхоўкі да 10 снежня, ліквідаваць пяродомкі па ўсіх плацяжах і выканаць квартальны план да 15 снежня.

СНК БССР з усёй катэгарычнасцю папярэджвае адстаючыя раёны, што калі да 1 снежня не будзе ліквідаваны прарыў у выкананні фінплана, да адстаючых раёнаў будуць ужыты меры фінансавых рэпрэсій.

З'яўляецца таксама недапушчальным і тое, што да гэтага часу сістэма спажывецкай кааперацыі не ўзялася як след за мабілізацыю паявых узносаў. Па Гомельскаму раёну, напрыклад, паявыя ўзносы сабраны толькі на 3 проц.

Задача рэспубліканскага і раённага друку ў гэтыя дзве рашаючыя декады штодзённа паказваць на старонках газет узоры барацьбы за фінплан перадавых і даваць па заслугах адстаючым.

Фінорганы, ударнікі фінансавага фронта павінны паказаць сябе сапраўдна актыўнымі ўдзельнікамі перавыбараў советаў і на з'ездах советаў дабіцца выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Наша грамадскасць, камсорды, профсаюзы, комсамол, піонеры, вучні ў апошнія дзве дэкады абавязаны аказаць актыўную дапамогу фінорганам у выкананні фінплана.

Кожны калгаснік і калгаснічка нашай рэспублікі па прыкладу калгаснікаў Чашніцкага, Менскага і інш. перадавых раёнаў павінны прыйсці да раённых з'ездаў советаў з поўным пагашэннем падпіскі на пазыку.

Бездакладна распачнуць сапраўды большэвіцкае спаборніцтва раёнаў, советаў, калгасаў, вёсак, арганізацый. Кожны раён, кожны сельсовет, кожны калгаснік, кожны аднаасобнік, кожная арганізацыя павінны прыйсці на раённы з'езд советаў з поўным выкананнем сваіх абавязкаў перад пролетарскай дзяржавай і гэтым самым забяспечыць БССР ганаровае права рапартаваць VII усесаюзнаму з'езду советаў і старшыні Совета Народных Камісараў СССР т. Молатаву аб большэвіцкіх перамогах на фінансавым фронце Беларускай ССР.

З БОЛЬШЭВІЦКАЙ СТРАСТНАСЦЮ АВАЛОДВАЦЬ ВЫШЫНЯМІ ТЭХНІКІ

СА СТАРОНАК ГІСТОРЫІ...

«Машына сама па себе скарачае рабочы час, між тым як яе капіталістычнае прыманенне падаўжае рабочы дзень; сама па сабе аблягчае працу, капіталістычнае-ж яе прыманенне павышае яе інтэнсіўнасць... сам па сабе яна знамянуе перамогу чалавека над сіламі прыроды, капіталістычнае-ж яе прыманенне паднявольвае чалавека сіламі прыроды» (МАРКС, «Капітал», т. 1, стар. 422).

***

«— Змоладу, змоладу треба глядзець, к чаму ў чалавека ахвота ёсць, — а не тнаць усіх без разбору за ўсякую справу! Ад таго і выгодніць: сёння — купец, заўтра — жабрак; сёння — пекар, а праз тыдзень, глядзі, дровы піліць пашоў... Вучыліща адкрылі і ўсіх заганяюць гвалтоўна — вучыся! і стрыгуць, як авец, усіх адзнымі ложніцамі... А треба даць чалавеку найсці сваё «пристрастие»—сваё!» (Горкі «Хозяин»).

***

«...Заглядаў я на варштат па токарнаму майстэрству яны былі), калёсы гэтыя розныя, шрубы, пойдзе часаць, пойдзе — адкуль што возьмецца... самлеў! «Хачу ды хачу, аддай ды аддай к майстру!... Ніхуды больш не найду!...» Але што-ж здарылася? Як я быў здзіўлен, калі, тры гады ў майстра жыўшы, ні разу да гэтага варштата доступу не атрымаў. Таму, уласна, што быў ён гэты варштат прамт». (Глеб Успенскі «Нравы Растеряевой улицы»).

***

«Недзе ў Ельцы памёр ад тыфу Міця Паўлоў, зямляк мой, рабочы з Сормава.

У 1905 г., у дні маскоўскага паўстання, ён прывёз з Пецербурга залежную скрыню капсулёў грымучай ртуці і 15 аршын бікфордавага шнура, абматаўшы яго вакол грудзей. Ад поту шнур разбух, бо занадта туга быў абмотан вакол рэбраў, але, увайшоўшы ў пакой да мяне, Міця зваліўся на падлогу, твар яго пасінеў, вочы выкаціліся, як гэта бывае ў людзей, памяраючых ад астмы.

— Вы звар'яцелі, Міця? Вы-ж маглі, дарагі страціць прытомнасць — разумееце, што тады было-б з вамі?

Задыхаючыся, ён адказаў вінавата:

— Прапаў-бы шнур і капсулі таксама...

М. М. Ціхвінскі, расціраючы яго грудзі, таксама гурклива лаяўся, а Міця, шчырачыся, пытаўся:

— Колькі будзе бомб? Разаб'юць нас? Прэсня трымаецца?

Потым, лежачы на дыване, указаўшы вачыма на Ціхвінскага, які разглядаў капсулі, запытаў шэпатам:

— Гэта ён тут бомбы робіць? Прафесар? З рабочых? Ды ну?

І раптам непакойна асведамійся:

— А не ўзарве ён вас?

Аб сябе-ж, аб той небяспецы, якой ён толькі што цудам уник — ні слова». (М. Горкі, замест некролага на смерць М. Паўлава).

***

«— Кім былі-б мы, калі-б рэволюцыя нас не застала на самым парозе свядомага жыцця? Чорт яго ведае кім! Відаць, рухаліся-б па слядах папярэдніх пакаленняў: Расслойваліся, працісваючыся к даходнаму месцу, «выходзілі ў людзі», лепшым-б працавалі ў падполлі, большасць спакойна пражывала-б у абывательшчыне, пагадзілася непасільнай прапай і вадзілай атмасферай буржуазнага ладу. Рашалі асяроддзе, абстаноўка, умовы быту і жыцця,—гадаць не прыходзіцца: па ўсякім выпадку, рэволюцыя, арэўнаваўшы ранейшыя сямейныя сувязі, апракінуўшы ідэі, імкненні і мэты ранейшых пакаленняў, узняла да свядомага творчага жыцця мільёны людзей, раней задаўленых цяжарамі жыцця, празябаўшых у хмурым муравейніку будняў. Рэволюцыя вырасціла новае пакаленне з новымі імкненнямі, іншай псіхалогіяй, іншымі ідэаламі і мэтамі...» Я. Ільін «Большой конвейер».

ШЛЕМІН І. Е. зотавец завода «Пролетарый» за зборкай насоса. (злева). ГЕТГОФ М. С. — кіраўнік тэхнічнага гуртка на заводзе «Пролетарый» (справа).

Я АВАЛОДАЎ ЗБОРКАЙ ПОМПАЎ

На завод «Пролетарый» я паступіў у 1929 годзе. Спачатку працаваў вучнем-слесарам, а пасля двухгадовага тэрміну навучання мяне паставілі на зборку помпаў «Верцінгтон», якія тады пачаў выпускаць завод. Спачатку выконваў асобныя працэсы работы, збіраў часткі помпы. Работа гэта аказалася досыць цяжкай і складанай. Галоўная труднасць была ў тым, што, працуючы над асобнымі дэталямі, я зусім не разумеў узаемадзейнасці частак, асноўныя прынцыпы, на якіх пабудавана работа помпы ў цэлым.

Адным словам, усё гэта было для мяне цёмна, нешк недасягальна. Адзінае, што ў мяне было — гэта вялікая ахвота ва што-б там ні стала аўладаць усімі працэсамі работы, давядацца і разабрацца ў гэтай складанай машыне.

Але і гэтага мала. Я ўвесь час уважліва прыглядаўся да кожнай дэталі, але патрэбнага эфекту не атрымлівалася.

Калі на заводзе арганізавалі тэхвучобу, тады і для нас гурток па зборцы быў створан. Гэта было вялікай радасцю для нас.

Чатыры месяцы правучыўся я і к 1 мая здаў першы ў брыгадзе сонтэхэкзамен па «выдатна».

Вялікую ролю ў аўладанні намі тэхнікай адыграў кіраўнік брыгады, тэхнік тав. Гетгафт. Ён першы даваў нам асноўныя тэарэтычныя веды, тлумачыў, што неабходна для таго, каб работа атрымлівалася найлепшай, знаёміў з фізікай, заняткі праходзілі надзвычай цікава і мы адчувалі, што пасля кожнай лекцыі атрымліваем нешта новае, цікавае, чаго не ведалі раней.

Уся тэхнічная вучоба суправаджалася практыкай.

Зараз я адзін поўнасцю збіраю самыя складаныя помпы «В-4». За ўвесь час пасля здачы тэхэкзамена не было ні аднаго выпадку браку. Мой месячны план — чатыры помпы, штомесячна даю пяць. Зразумела, што і заработная плата мая значна павялічылася.

Але ўсё-ж мяне гэта не задавальняе. Я хачу зараз аўладаць зборкай варштата «Калава». Гэта найбольш складаная машына, чым помпа. Пачаў знаёміцца з чарцяжамі. Выпісаў журнал «Советская машина». Думаю, што і гэтаму навучуся, бо магчымасці на заводзе ёсць, а ахвота да тэхнічнай вучобы таксама не малая.

ШЛЕМІН І. Е.

Зотавец завода «Пролетарый».

НАША БРЫГАДА —СТАЛІНСКАЯ

Зборка помпаў — адказнейшая работа на заводзе. Яна рашае лёс помпы. Можа быць добрае ліццё і апрацоўка ўсіх дэталей, а дрэнны зборшчык можа ўсё папсаваць, перабыткаць і даць негодную помпу. Вось чаму тэхнічная вучоба для гэтай брыгады — важнейшая справа. Да арганізацыі тэхнічнай вучобы нас падштурхнулі яшчэ нашы спажыўцы. К канцу 1933 года і пачатку 1934 мы атрымалі многа скаргаў ад нашых спажыўцоў з Урала, Тіфліса, Масквы, Паўночнага Каўказа. У асноўным указаныя ў пісьмах дэфекты адносіліся к зборшчыкам. Гаварылі аб дрэннай шаброўцы залатнікоў, прыпёрцы клапанаў і паотул аб дрэннай, неахайнай зборцы машыны.

Тады ва ўсю шырыню паўстала пытанне аб тэхнічнай вучобе. Арганізавалі мы яе з студзеня і адразу ахапілі 17 чалавек. Тады гэта была ўся брыгада па зборцы помпаў. Як працякала наша вучоба? Я, як кіраўнік, паставіў перад сабой задачу—кожны, які працуе на зборцы, павінен добра ведаць усю машыну, яе тайны і «капрызы», і толькі тады ён з гэтай работай справіцца.

У тэхнічнай вучобе мы прымянялі розныя метады. Часамі я чытаў лекцыі і выдзяляў для запісаў асноўныя пытанні. Усе запісы рабіліся ў пастаянных спытках. Некалькі слоў аб спытках. Гэта здаецца на першы погляд дробязь, але яны, гэтыя спыткі, маюць вялікае значэнне. Звычайна бывае так, што спытак губляць, а на наступныя заняткі прыносяць другі. Я са сваімі слухачамі дагаварыўся так, каб спыткі хаваліся ў мяне і запісы рабіліся толькі ў адным спытку. Калі канчаецца тэма, кожны рабочы атрымліваў у мяне свой спытак з пэўнымі заўвагамі і паўтарае ўсё, што запісана ў ім.

Вывучэнне помпы праходзіла непасрэдна ў цэху тут-жа, пры ёй.

Зразумела, не ўся брыгада адразу стала зотаўскай. Першы выпуск быў у маі. Тады на «выдатна» здаў толькі адзін рабочы тав. Шлёмін, астатнія на «добра» і «здавальняюча». Але вучоба не спынялася. Асаблівую ўвагу я звярнуў на таварышоў, якія адстаюць, часта збіраў іх пасля работы, гутарыў з імі. Такім чынам мы дабіліся таго, што ўся брыгада здала тэхэкзамен на «выдатна». Зараз уся брыгада з 34 чалавек — зотаўская, выдатная. Нашай брыгадзе надана імя таварыша Сталіна.

Каб ахарактызаваць уплыў тэхвучобы на работу брыгады, можна прывесці такі прыклад. За апошнія месяцы мы не атрымалі ніводнай скаргі спажыўца, сістэматычна перавыконваем пром фінплан. Чарговай нашай задачай мы лічым арганізаваць другі тур тэхнічнай вучобы.

ГЕТГОФТ М. С.

Тэхнік завода «Пролетарый», кіраўнік тэхгуртка.

КРЫЦКІ ВАСІЛЬ — сфармаўшчык-зотавец завода «Красны металіст». (злева). ГОРСКІ І. Ф. — начальнік ліцейнага цэха завода «Красны металіст». (справа).

МАЯ МЭТА—ДАБІЦЦА ЗВАННЯ МАЙСТРА

На завод «Чырвоны металіст» я паступіў у 1931 годзе, не маючы ніякай кваліфікацыі. У мінулым, лічачыся непоўнаспрытульным (быць ка інвалід, маці памерла), некаторы час працаваў у бляшана-кровельнай майстэрні.

Прыбыў на завод. Мяне адразу назначылі ў ліцейны цэх на ўчастак фармоўкі. Я гэту работу палюбіў і паставіў сабе мэтай стаць кваліфікаваным фармаўшчыком.

Але аднаго жадання мала. Фармоўная справа паміма навыку патрабуе дэтальнага яе вывучэння. Вось чаму я вельмі ўзрадаваўся, калі ў цэху на нашым участку арганізаваўся тэхгурток. Я стаў яго шчырым прыхільнікам. Сістэматычна, без адзінага прапуску наведваў заняткі, уважліва прыслухоўваўся да голасу кіраўнікоў гуртка тт. Горскага і Израўкіна, якія выкладалі нам як тэорыю, так і практыку.

Кожны дзень тэхзаняткаў адкрываў мне рад навін. Я пазнаваў тое, аб чым раней паняцця не меў. Паступова вывучыў склад фармовачнай зямлі, сортнасць пяску, прымяненне яго да поўных дэталей і т. д. і т. д. Тэарытычна і практычна падрабязна вывучыў працэсы набіўкі форм, іх адмеллку і зборку.

Але, галоўнае, мяне радуе тое, што ў тэхгуртку я вывучыў прычыны браку. Прыраду прыклад з сваёй работы. Вельмі часта бывала пры заліўцы форм вельмі размывала літнікі і ў радыятары атрымлівалася цеч — яўны брак. Я ніяк раней не мог здагадацца, дзе тут корань зла, а цяпер, пасля прахаджання курса тэхвучобы, я даведаўся, што размыўка літнікаў ёсць рэзультат таго, што літнікі фармаваліся з фармовачнай зямлі без сумесі спецыяльнага фармовачнага складу.

Курс навучання ў гуртку я скончыў паспяхова.

Гляджу я на сябе сёння і самога сябе не пазнаю. Працаваць стала куды лягчэй і сама работа — куды лепшая за мінулую. На працэсе фармоўкі радыятараў я сваю штодзённую вытворчую праграму выконваў на 115-120 проц. і брак з 8 проц. даведу да 2-2,5 проц., а часта і таго менш. Фармаваў таксама рад іншых адказных дэталей, як тарцовыя шасцёркі к конным прывадам «3-4» і інш. Заўсёды даваў добрую якасць. Сёння я стаю на працэсе фармоўкі стоек к токарным плугам «АДТ». Пры штодзённым перавыкананні нормы, я брак па стойках даведу да 1 проц., а ў апошнія дні браку зусім не маю.

Стаўшы лепш працаваць, пачаў больш зарабляць. Так, да тэхвучобы мой месячны заработак ў сярэднім складаў 180 руб. Цяпер я ўжо зарабляю 240-260 руб. у месяц.

Дабіўшыся павышэння кваліфікацыі, зараз я паставіў сабе мэтай ва што-б там ні стала дабіцца звання майстра. Вось чаму я з вялікай цікаўнасцю чакаю, калі на нашым участку фармоўкі будзе арганізаваны гурток па павышэнню кваліфікацыі нас — зотаўцаў.

КРЫЦКІ ВАСІЛЬ.

Фармаўшчык ліцейнага цэха завода «Чырвоны металіст», зотавец.

МОЙ ВОПЫТ

Рознастайнасць адказных дэталей да складаных машын і запчастак, выраблямых нашым цэхам, патрабуе дэтальнага вывучэння ліцейнай справы ва ўсіх яго працэсах (фармоўка, разліўка, абрубка і інш.). Практычны навык плюс тэарэтычная падрыхтоўка — абавязковая ўмова, забяспечваючая выкананне колькасных і якасных паказальнікаў промфінплана. Асабліва гэта датычыць моладых рабочых, уліўшыхся ў наш ліцейны цэх за апошнія адзін-два гады.

Гэта акалічнасць прымусіла нас разгарнуць у цэху тэхнічную вучобу, ахапіўшы ёю ўсіх рабочых, занятых на рознастайных участках. Мне, як старому вопытнаму ліцейшчыку, даручылі выкладаць у тэхгуртку, дзе вучыліся фармаўшчыкі.

Чаму-ж канкрэтна мы навучаем рабочых нашага цэха ў тэхгуртках?

Для прыкладу спынюся на рабоце тэхгуртка па вывучэнню фармовачнай справы. У першую чергу мы азнаямляні рабочых з упасцівасцю фармовачнай зямлі, сортнасцю пяска, распумачвалі, які пясок неабходна ўжываць для пэўнай дэталі. Скажам, для фармоўкі шасцярэй неабходна ўжываць не буйны пясок: не вышэй аднаго кубічнага міліметра і не ніжэй 0,25 куб. м.м. Указвалі на неабходнасць ужывання рачнога прамытага пяску і ўніканння ўжываць горны пясок, бо апошні мае ў сабе вялікую засмечанасць і неаднароднасць зёрнаў. Разам з гэтым мы навучалі рабочых правільнаму выкарыстанню прапорцый гліны, каменнага мопатага вугалю, звільгатненню зямлі і правільнаму змешванню зямлі пры дапамозе спецыяльных машын.

Азнаёміўшыся з самой упасцівасцю вывучэння зямлі, мы перайшлі да вывучэння працэсу набіўкі форм. Распумачвалі, што моцнасць набіўкі форм павінна выходзіць з размеру таўшчыні цела і размеру самой дэталі. Адначасова паказвалі рабочым, як трэба правільна ўстаўляць літнікі і шаўкавікі і прарэзваць каналы.

Вельмі часта атрымліваецца брак ад няправільнай набіўкі формы (моцная набіўка тонкай дэталі і, наадварот — слабая набіўка тоўстай дэталі, а таксама ад няправільнага вываду газу або перамочкі зямлі і т. д. і т. д.

Які-ж рэзультат мы маем ад тэхнічнай вучобы?

Наш ліцейны цэх стаў сістэматычна выконваць колькасныя паказальнікі промфінплана. У значнай ступені палепшылася якасць фармоўкі. Дэталі сталі выходзіць часцей і прыгажэйшыя.

Цэлы рад фармоўшчыкаў сталі непазнаваема лепш працаваць. Узяць хоць-бы к прыкладу тт. САЛАМОНАВА або ШАПКО. У рэзультаце тэхвучобы яны знізілі процант браку больш чым на палову. А што датычыць нашых зотаўцаў, як напрыклад, тт. Костыркіна і Цыганкова, то на працэсе фармоўкі радыятараў яны замест дапускаемых планам 8 проц. даюць не больш 5-6 проц.

Асабліва вялікіх поспехаў у вучобе дабіўся тав. КРЫЦКІ ВАСІЛЬ. Ён завод т. КРЫЦКІ прыбыў, не маючы абсалютна ніякага паняцця аб фармоўцы. Сваімі добрасумленнымі адносінамі і вялікай любоўю да ліцейнай справы ён праз невялікі перыяд часу атрымаў кваліфікацыю фармаўшчыка III разраду. Тэхнічная вучоба яго яшчэ больш падкавала. Ён здаў тэхэкзамен на «выдатна», атрымаў значок «ЗОТ». Зараз мы яго пераявялі ў IV разрад. Ён дае добрую якасць прадукцыі і сістэматычна перавыконвае свае норму. З II у III разрад пераведзены таксама пасля атрымання значка «ЗОТ» фармаўшчыкі тт. РОЛЕЎ і ШАЛУХІНА.

Паміма існуючых у цэху тэхгуртко ў нашы майстры наведваюць тэхгурток павышанага тыпу, дзе яны вывучаюць тэхналогію метала, чарцёжную справу і матэматыку.

ГОРСКІ І. Ф.

Начальнік ліцейнага цэха завода «Чырвоны металіст», выкладчык тэхгуртка.



Менскі чырвонасцяжны завод імя Варашылава—завод сучаснай тэхнічнай граматнасці. Завод асвоіў рад складаных машын і варштатаў. Яго варштаты вытрымалі іспытанне і на тэрфазаводах і на радзе заводаў Саюза. На здымку 40-міліметровы свідравальны варштат.

Я МАГУ ПЕРАДАЦЬ АБ ГЭТЫМ...

(З дзенніка зотаўца Сяргея Давыдзюка)

1926 год. Першага студзеня стаяў моцны мароз, ён наклаў сваю лапу на вокны канторы шклозавода «Пролетарый». Я паступаў на работу. Дырэктар сказаў:

— Заўтра прыходзь, пляшкі будзеш адносіць...

Прачынаюся рана, хутка апранаюся і бягу на завод. Адношу пляшкі і заходжу тым, што навучыліся і выдуваюць пасуду. Ішлі дні... І я праз год давучыўся выдуваць аптэкарскую пасуду. Павялічваецца з кожным месяцам мой заработак.

Наступаў дваццаць сёмы год. Чэрвень месяц. Шклозавод быў спынен на капітальны рамонт. Рабочыя раз'ехаліся хто куды, а я паступіў на завод «Энергія». З першых дзён палюбіў я новае прадпрыемства.

Працую чорнарабочым уресь дваццаць восьмы год. Не прынёс нічога новага для мяне і дваццаць дзевяты. А хочацца мне стаць слесарам. Пачынаю прыглядацца, вучуся. У часе абедзеных перапынкаў прабую апрацоўваць асобныя нескладаныя дэталі. Пальцы пазбіваў. Убачыў аднойчы майстар Паўлоўскі забінтаваныя пальцы і пачаў жартаваць:

— Выйдзе з цябе толк Сяргей, будзеш слесарам!

— Стараюся...

— Відаць на пальцах.

І Паўлоўскі, Галярэвіч сталі дапамагаць мне. Вучылі слесарнай справе. І я стаў слесарам...

15 снежня. Сёння для мяне вельмі радасны дзень. Мяне паставілі на самастойную работу. Хвалююся, справа кепска клеіцца. Хлопцы з мяне смяюцца і таму я з імі мала гавару. Усё вучуся, стараюся пазнаць тайны тэхнікі...

Праходзяць гады — трыццаты, трыццаць першы і трыццаць другі.

...1933 год. 1 сакавіка. Толькі што прыйшоў з работы і рашыў запісаць радасную вестку. Сёння мне паставілі на рамонт трактароў. Набліжаецца пасеўная кампанія. Весела сёння было працаваць. У брыгадзе ў нас адна моладзь. Ударная работа, весёлыя песні. Добра...

5 красавіка. Здаем трактары. Зараз прыдзецца ўзяцца за 40-міліметровыя свідравальныя варштаты. Гэта складаная штука. Варштаты гэтыя нямецкай канструкцыі. Прыдзецца здорава папрацаваць.

15 чэрвеня. Свідравальныя варштаты асвоілі. Цяжка далася гэта справа. Не хапае тэарэтычных ведаў. Учора запісаўся ў гурток. Пачну сур'ёзна вучыцца. Сёння ўзяў з сабой кніжкі, дзе пішацца пра багер, за які трэба зараз узяцца. Павучараў і пачаў чытаць. Чытаў гадзін дзве і нічога не зразумеў. Крыўдна...

16 чэрвеня. Прыдзецца пісаць больш падрабязна і кожны дзень. Я адчуваю свой рост. Вось сёння прышоў па гадзіну раней на завод. Хутка прышоў інжынер Шлапакоў. Доўга мы з ім гутарылі пра багер. Сёння-ж пачалі яго зборку. Не клеілася, праўда, работа. Разглядалі мы чарцяжы і нічога ў іх не разумелі. Пасля работы сабраўся гурток, і мы падрабязна вывучалі чарцяжы галоўнай перадачы рычага ўпраўлення багера.

17 чэрвеня. Крыху пачынаю разумець чарцяжы...

19 чэрвеня. Брыгада наша бярэ на сябе абавязак к 1 мая 1934 года закончыць багер. Ці справімся? Трэба будзе паднатужыцца.

1934 год. 29 красавіка. Сёння здаем багер. У нас двайное свята: я здаў тэхнічны экзамен. Праўда, хваляваўся крыху. Але нічога. Экзамен вытрымаў на «выдатна».

30 красавіка. Я пачынаю збіраць 40-міліметровыя варштаты. Не хвалююся я больш. Сваю справу ведаю па зубок.

15 мая. Вучу навічкоў Грынкевіча, Шаблоўскага і Пішчакоўскага. Сам хаджу штодзённа на кансультацыю да інжынера Рошчына. Цяпер я кіраўнік брыгады па зборцы варштатаў. Мая брыгада перавыконвае план і дае высокую якасць зборкі. Хачу стаць майстрам. І я гэтага, безумоўна, дабіўся!

27 лістапада. Заўтра еду на злёт лепшых зотаўцаў цяжкай прамысловасці. Брыгада, якою я кірую, 29 выконвае заданне на 126 проц. Брыгада прасіла мяне перадаць аб гэтым злёту зотаўцаў, і я гэта зрабіў!

ЦЯЖКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БССР ДА КАНФЕРЭНЦЫІ „ЗОТ“

За апошнія гады значна вырасла цяжкая прамысловасць Савецкай Беларусі. З'явіліся новыя вытворчасці, зусім змяніўся твар усёй прамысловасці краіны.

Валавая прадукцыя цяжкай прамысловасці вырасла **з 6,7 млн. руб.** (у пазмечных цэнах) у **1931 г. да 120 млн. руб.** у **1934 г.**

Толькі ў гэтым годзе ўпершыню тарфяная прамысловасць выканала гадавы план.

Прамысловасць будматэрыялаў упершыню за апошнія гады наблізілася да поўнага выканання плана і ўжо зараз план па цэглесырцу выканан на **100 проц.** і па цэгле-абжыгу на **91 проц.**

Значна ўзраслі асноўныя фонды цяжкай прамысловасці: з **56 млн.** руб. на 1 студзеня 1932 г. на **123,8 млн.** руб. да канца 1934 г. Рэканструяван рад заводаў металаапрацоўчай прамысловасці і будматэрыялаў.

Пашыраны торфазаводы. Заканчваецца будаўніцтвам Быхаўскі ацэтона-буцілавы завод, Аршанскі селікатны завод, механаборачны цэх завода «Комунар».

За апошнія тры гады ў цяжкую прамысловасць укладзена **103 млн.** руб.

Металапрамысловасць, якая складала ў даваенны час некалькі дробных прадпрыемстваў з

СВІРЫДАЎ

Нам. наркома мясцовай прамысловасці

валавой прадукцыяй у 2,5 млн. руб. і магутнасцю рухавікоў у **750** конскіх сіл, выпускае зараз, у 1934 г., прадукцыю на суму ў **52 млн. руб.**

Уведзен у строй Магілёўскі трубаліцейны завод. Зусім рэканструяваны заводы: «Комунар», імя Варашылава, завод ланцугоў Галля, «Пролетарый», ідзе рэканструкцыя акулярнай фабрыкі ў Віцебску.

Значна ўзрасла культура прадукцыі металазаводаў і асвоены новыя вытворчасці.

Для сельскай гаспадаркі нашы заводы вырабляюць сіласарэзкі, бульбасартоўкі, бульбакапалкі, жмыхадрабілкі, корнерэзкі, канюшынасартоўкі і інш.

Для будаўніцтва мы вырабляем гравіясартоўкі, камнедрабілкі, растворамяшалкі, і фрыкцыйныя лябёдкі.

Для прамысловасці нашы заводы вырабляюць свідравальныя варштаты, торфамашыны, абутковыя, вальцавыя і токарныя варштаты. Асвоены і зняты з імпарта рэзьба-нарэзныя варштаты «Тиль». Яны асвоены заводам «Чырвоны металіст», а завод «Комунар» асвоіў працяжны варштат і пілу «Орыен-Ганнс». Помпы «Варцінгтон» вытворчасці завода «Пролетарый» занялі манапольнае становішча ў СССР. На заводзе імя Варашылава ўпершыню асвоен багер.

Адсоль відаць, якія поспехі мы маем за апошнія два гады. Аднак, металапрамысловасць, як адна з найбольш развітых галін народнай гаспадаркі, не можа больш абмяжоўвацца толькі абслугоўзаннем бурна растучай народнай гаспадаркі БССР і таму па плану другой пяцігодкі павінны быць асвоены яшчэ больш складаныя машыны для усяго Саюза, якія патрабуюць найлепшай апрацоўкі і найбольшай дакладнасці.

Па плану другой пяцігодкі рэканструкцыя заводаў намячаецца ў напрамку спецыялізацыі асобных найбольш вядучых заводаў.

Для станкабудаўніцтва выдзяляюцца і атрымліваюць свае вытворчыя афармленні заводы «Чырвоны металіст», «Комунар» і «Пролетарый». На гэтых заводах замацоўваецца і атрымлівае сваё далейшае развіццё вытворчасць варштатаў, знятых з імпарта. На заводзе «Пролетарый» значна расшыраецца выраб помпаў «Верцінгтон».

Для патрэб агульнага машынабудаўніцтва і абслугоўвання тарфяной прамысловасці і будматэрыялаў выдзяляецца група заводаў: завод імя Варашылава, «Адраджэнне» (Магілёў), імя Сталіна (Бабруйск), «Рухавік рэволюцыі» (Гомель).

Група цікавых заводаў—«Інтэрнацыянал» у Рэчыцы і «Чырвоны Сцяг» у Оршы — захоўваюць сваю асноўную прадукцыю, значна пашыраючы яе. Для мэты вагарамонту поўнасцю асвойваецца завод «Узарнік», на якім значна расшыраецца вытворчасць вагаў і ў асабліваці вазункі.

Магілёўскі трубаліцейны завод даводзіцца ўжо ў 1935 г. да поўнай магутнасці — 10 тыс. тон водаправодных труб. Для вытворчасці запасных частак для трактароў і рамонту с.-г. машын выдзяляецца завод «Чырвоны барацьбіт» у Оршы.

Асабліва вялікім укладам у прамысловасць будматэрыялаў ва ўмовах БССР з'яўляецца пабудова Крычаўскага цэментнага завода магутнасцю ў 720 тыс. бочак цэменту.

Перад хімічнай прамысловасцю БССР ўсталі зараз дзве праблемы. Першая — асвоіць хімічную перапрацоўку торфу і, па-другое, аўладаць сапрапелевымі багаццямі. У гэтым напрамку павінна пайсці далейшае развіццё хімічнай прамысловасці.

З усяго, што сказана вышэй, відаць, як разгарнулася прамысловасць за апошнія гады. Мы маем бясспрэчныя поспехі і ў справе асваення. Зусім зразумела, што гэтых поспехаў мы не маглі дабіцца без самаўдасы масава разгорнутай барацьбы за аўладанне тэхнікай.

Асабліва шырока разгарнулася тэхнічная вучоба за апошні час— у перыяд падрыхтоўкі да злёта зотаўцаў. У цяжкай прамысловасці працуе **17.630 чал.**, з іх **12.562 чал.** падлягаюць абавязковаму праходжанню тэхнічнага мінімума. Ахоплена тэхнічнай вучобай пакуль **6.432 чал.**, а соцтэхэкзамен здала **4.393 чал.** Выдатнікаў з іх **1592 чал.**

Найбольшы ахоп тэхнічнай вучобай дасягнут па металапрамысловасці. З **3845** чал., падлягаючых абавязковаму праходжанню тэхвучобы, ахоплена **2.539**, а соцтэхэкзамен здала **1834 чал.** Значныя поспехі па ахопу тэхвучобай дасягнулі заводы імя Варашылава, «Комунар», «Пролетарый» і акулярная фабрыка. Адстае яшчэ завод ланцугоў Галля.

Падводзячы вынікі работы прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці БССР да злёту, трэба адзначыць, што зусім недастаткова зварачалі ўвагу на тэхвучобу на торфазаводах. Гэта ганебны факт, калі ў час падрыхтоўкі да злёту торфаводы не мелі ніводнага зотаўца і толькі апошні час прынёс некаторае палепшэнне.

Недастаткова разгорнута тэхвучоба і ў прамысловасці будматэрыялаў.

Зотаўцы на прадпрыемствах паказалі сябе сапраўднымі застрольшчыкамі барацьбы за выкананне промфінплана, за палепшэнне якасці прадукцыі.

Асабліва трэба падкрэсліць удзел зотаўцаў у складанні тэхпромфінплана і пачын рабочых завода «Чырвоны металіст» (Віцебск), якія высунулі новую вышэйшую форму асвоення тэхнікі, гэта здача соцтэхпрасектаў (дыпломныя работы). На гэтым заводзе 8 зотаўцаў ужо здалі свае дыпломныя праекты.

Рыхтуючыся да злёта зотаўцаў, акулярная фабрыка практыкуе ўзаемные пэфэтва па складанню тэхпромфінплана з пачэсным фабрыкай. У цяжкай прамысловасці недастаткова скарыстан вопыт завода «Большэвік» па стварэнню інстытута грамадскіх тэхнаручаў.

На падставе вопыту перадавых прадпрыемстваў пасля злёту неабходна будзе дабіцца карэннага пералому ў выкананні промфінплана і, ў першую чаргу, ліквідаваць запазычанасць, якая пагражае выкананню гадавога плана.

Толькі адна рэспубліканская цяжкая прамысловасць неддала краіне прадукцыі на 5.105 тыс. руб.

У нас ёсць усе магчымасці ліквідаваць гэту запазычанасць. Аб гэтым красамоўна сведчыць той факт, што заводы імя Варашылава і «Пролетарый» ужо выканалі гадавы план.

Цяжкая прамысловасць, найбольш адсталая ў дарэволюцыйны час, заняла зараз адно з перадавых месц у народнай гаспадарцы, лозунг партыі аб пераўтварэнні адсталай краіны ў індустрыяльна-аграрную з высокаразвітай тэхнікай праведзен ў жыццё.

Гэтых поспехаў цяжкая прамысловасць БССР дабілася ў выніку мужнага ажыццяўлення генеральнай лініі партыі, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК ВКП(б)Б і ўрада БССР, маблізуючы рабочых масы на выкананне плана, шырока ўкараняючы соцыялістычныя метады працы, выхоўваючы кадры камандзіраў прамысловасці, змагаючыся за аўладанне тэхнікай і выкананне плана.

Перспектывы далейшага развіцця прамысловасці прадугледжваюць усім работнікам, рабочым, партыйным і прафсаюзным арганізацыям прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці асабліва пазнаёміцца і складныя задачы.

Вопыт мінулых год сведчыць аб тым, што мы з гэтымі задачамі з гонарам справімся.

АДОЗВА ІСПАНСКАЙ СЕКЦЫІ МОПР

Да працоўных, пабеданосна будуючых соцыялізм у СССР

Таварышы! Дзесяткі тысяч працоўных, ахвяр рэпрэсій і тэрора рэакцыйнай і фашысцкай буржуазіі Іспаніі, шлюць вам праз пасрэдства Іспанскай секцыі МОПР сваё сардэчнае і брацкае рэвалюцыйнае прывітанне.

Прыгнечаныя і эксплуатуемыя масы Іспаніі, па-брацку аб'яднаныя адзіным фронтам, паўсталі са зброяй у руках супроць голада і галечы, супроць рэпрэсій і тэрора. Наёмныя ўзброеныя сілы фашызма забілі звыш 4 тысяч чалавек і параніле больш 10 тысяч. Звыш 60 тысяч працоўных — рэвалюцыянераў былі арыштаваны і кінуты ў цёмныя казематы буржуазіі.

Іспанская секцыя МОПР, якая працуе за ўмовах глыбокай нелегальнасці, неадкладна, не працячы ні мінуты арганізавала дапамогу ахвярам іспанскай рэвалюцыі. Але калета, пануючай за ўсёй краіне, абвостраная ашчэ буржуазіяй, выкінуўшай на вуліцу новыя дзесяткі тысяч рабочых і асуджаўшай іх на беспрацоўе і роспач, так вялика, што Іспанская секцыя МОПР не здольна задаволіць усіх патрэб.

Іспанская секцыя МОПР звяртаецца да працоўных усяго свету і звяртаецца зараз асобна к вам, каб вы заклікалі прапоўныя масы да рэвалюцыйнай пролетарскай салідарнасці, да аказання дзейснай дапамогі ахвярам іспанскай буржуазіі.

Працоўныя Совецкага Саюза! Пра ваўныя бапькаўшчыны сусветнага пролетарыята!

Працоўныя масы Іспаніі зноў пачынаюць арганізоўваць сваё наступленне для перамогі нашага чырвонага Кастрычніка.

Мы ведаем, што наш заклік будзе пачут у самых далёкіх кутках нашай неабсяжнай соцыялістычнай краіны і што на наш заклік да салідарнасці з радасцю адгукнуцца ўсе грамадзяне Совецкага Саюза.

Іспанская секцыя МОПР.

Новыя назначэнні

МАСКВА, 27 лістапада. (БЕЛТА). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР назначыў т. ПАЦЕМКІНА Уладзіміра Пятровіча паўнамочным прадстаўніком Саюза ССР ва Францыі, вызваліўшы яго ад гэтых абавязкаў у Італіі.

МАСКВА. 27 лістапада. (БЕЛТА). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саюза ССР назначыў т. ШТЭЙНА Барыса Ефімовіча паўнамочным прадстаўніком Саюза ССР у Італіі, вызваліўшы яго ад гэтых абавязкаў у Фінляндыі.

За рубяжом

ФАШЫСЦКІ ПРЫГАВОР НАД БЫЛЫМІ КОМУНІСТЫЧНЫМІ ДЭПУТАТАМІ РЭЙХСТАГА

БЕРЛІН, 26 лістапада. (БЕЛТА). Народны суд вынес прыгавор па справе трох былых комуністычных дэпутатаў рэйхстага, абвінавачваемых у кіраўніцтве нелегальнай работай арганізацыі КПГ у Рурскай вобласці. Суд прыгаварыў Пфейфера, па абвінавачанню ў тым, што ён быў нібыта нелегальным інструктарам ЦК КПГ,—да трох год катаргі, Паўля—да двух год з паловай катаргі і Геннига—да двух год турмы.

Адначасова прыгаворана да года і трох месяцаў турмы арыштаваная разам з імі жанчына, якая нібыта выконвала абавязкі сакратара.

НЕЛЕГАЛЬНАЯ ГАЗЕТА КАТАЛОНСКАЙ КОМПАРТЫІ

ПАРЫЖ, 26 лістапада. (БЕЛТА). «Юманіта» перадае амест першага нумара нелегальнай газеты каталонскай компартыі «Лута» («Барацьба»). Увесь нумар газеты, выдаваемай на каталонскай мове, прысвечан рознастайнаму матэрыялу, які ілюструе ўдзел комуністычнай партыі ў нядаўніх баях.

Газета друкуе імёны спіс усіх каталонскіх рэвалюцыянераў, загінуўшых у кастрычніцкіх баях, а таксама ўсіх параненых і арыштаваных. Газета асобна адзначае, што ў спісе ўспамінаюцца прозвішчы Баптрыка і Контпаньба, якія гераічна загінулі, абараняючы памяшканне профсаюза служачых.

АСТУРЫЙСКІЯ КАПАЛЬНІ ЗАКРЫТЫ

ЛОНДАН, 26 лістапада (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда, туды прыбыла брытанская гандлёвая дэлегацыя. Мадрыдскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» адзначае, што брытанскія вугледабыўныя прамысловцы могуць разлічваць на ўвоз вугалю ў Іспанію ў бліжэйшы час, бо паводле звесткі Леруса, вугольныя капальні ў Астурыі не будуць закрыты пакуль не будуць адбудаваны ўсе гарнякі. Лерус заявіў таксама, што астурыйскія капальні да поўнага разбурэння гарнякоў будуць закрыты нават і ў тым выпадку, калі патрабуецца дазволіць увоз вугалю з-за мяжы.

Совецкія экспанаты на парыжскай авіяцыйнай выстаўцы. 16 верасня ў Парыжы адкрыўся міжнародны салон авіяцыі на якім СССР прадстаўлена рад экспанатаў прывлекаючы агромны інтарэс публікі (гандлёвы аэрастат СССР, самалёт Молакава і інш.) на здымку перад адкрыццём выстаўкі камандзір стратастата СССР т. Пракоф'ёў стаіць на скрыльцы ў гандлёвы стратастат.

ЗАКРЫЦЦЕ ПРОЛЕТАРСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ВЕНГРЫ

ВЕНА, 26 лістапада. (БЕЛТА). Па паведамленню з Бухарэста ўчора камандуючы другім бухарэстскім армейскім корпусам генерал Прэзан па згадненню з міністрам унутраных спраў на аснове закона аб асадным становішчы, забараніў рад арганізацый працоўных з матывіроўкай, што яны «маюць акрэслены комуністычны характар» або «маюць адносіны да Совецкага Саюза».

Забаронена звыш 30 арганізацый, у тым ліку: пролетарскія аб'яднанні, рабочыя клубы, таварыства прыхільнікаў СССР, чырвоны профсаюз тэкстыльных рабочых і другія профсаюзы, антыфашысцкія камітэты, усерумынскі камітэт антыфашысцкай моладзі, аб'яднанне рэвалюцыйных студэнтаў, рабочыя культурныя аб'яднанні, яўрэйская «Культурліга» і інш.

У памяшканнях забароненых арганізацый арыштаваны бюсты, канфіскаваны архівы перапіскі і інш. матэрыялы.

„ЧАПАЕВ" УВОЙДЗЕ У ВЯКІ

У менскім Доме партактыва сёння не звычайны сход. Сабраліся старыя рабочыя, комсамольцы, дырэктары заводаў, камандзіры Чырвонай арміі. Па ініцыятыве Менскага гаркома партыі сабраліся яны сюды, каб у таварыскай гутарцы падзяліцца ўражаннямі аб фільме «Чапаеў».

Першае слова тав. Варончанне дае камандзіру Н-скага палка, старому чапаеўцу тав. Гемзякову.

Цёпла і радасна сустракае аўдыторыя старога байца.

— Мы вялі бесплатэйную класавую барацьбу. Чапаеўцы — гэта ранейшыя парабкі, якія за кавалак сухога хлеба прапанавалі ў уральскіх казакаў-багацеяў. І вось нявольнік падняўся супроць свайго гаспадара. Гаспадары-казакі пашлі агнём і мячом супроць сваіх былых нявольнікаў, каб вярнуць іх пад свой прыгон. Тут не да літаці было. Адны другіх у палон не бралі.

— І калі бачыш гэты фільм, усё гэта аднаўляецца ў памяці

Мы перамаглі. Бо сіла паўстаўшага народу непераможна. Мы бралі сваёй верай у нашу правату, мы бралі, бо партыя Леніна нас арганізавала на перамогу.

Выступае тав Панішаў — чапаевец, узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга.

— Калі таварыш аб нашым кавалерыйскім дывізіёне, дык у нас, лігаральна быў усяго толькі адзін «кольт». Ды і той сапсуты. Пасля ўжо мы ўзброіліся за кошт трафеяў, забраных у ворага. З пачатку нас адзіўляла тактыка Чапаева. А пасля палюбілі.

— Першы раз убачыў я яго нечакана. Я быў у перадавым дазоры. Гляджу — чалавек на вышцы млына стаіць. Падыходжу: — Ты хто — чырвоны ці белы? — пытаю яго. — А табе хто патрэбен? — Мы да Чапаева на палмогу. — Ну, дык я Чапаеў, ходзем. — Яго асабістая адвага нас заахвяляла і вучыла.

Аўдыторыя гучна апладыруе герою-чапаеўцу, якога змяняе тав. Тэвус, малады рабочы фабрыкі імя Кагановіча.

— Пакідаеш кіно з зайздрасцю: чаму так позна нарадзіўся. Так і хочацца быць з імі ў бою. Фільм кліча, заахвяляе. Рабочая моладзь на гэтым фільме вучыцца рэвалюцыйнаму гераізму і не толькі на франтах барацьбы, але і на франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

Выступае рабочы-ліцейшчык тав. Уманскі, сакратар парткома «Комунар» т. Гурагіс, мастацкі кіраўнік польскага тэатра тав. Тэрноўскі, дырэктар завода «Комунарка» Любін, пісьменнік Шапавалаў, тав. Зарым і інш. Усе яны гаворыць аб вялікім творчым і вытворчым уздыме, які выклікан з'яўленнем «Чапаева» на экране.

Далёка за поўнач зацягнуўся незвычайны сход.

Л. Н.

ПОМНІК ЧАПАЕВУ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ

У майстэрнях камбіната наглядной агітацыі і прапаганды Ленінградскага совета закончана адліўка помніка Чапаеву, які будзе ўстаноўлен у цэнтральным парку культуры і адпачынку. Помнік, адліты па праекту вядомага скульптара Манізера, з'яўляецца копіяй помніка, пастаўленага Чапаеву ў яго родным горадзе.

КУРСАНТ АРКАДЗІ ЧАПАЕЎ

У №-скай авіяцыйнай школе вучыцца сын героя Чапаева—Аркадзі Чапаеў. А. Чапаеў з'яўляецца ўзорным курсантам. Ад бацькі ён атрымаў у спадчыну большавіцкую настойлівасць і ўпартасць у дасягненні пастаўленай мэты. Ён з поспехам авалодвае складанай авіяцыйнай тэхнікай.

Як адзін з лепшых ударнікаў школы, да XVII гадавіны Окцябра ён рапартаваў аб сваіх поспехах У рапарце А. Чапаева гаворыцца: «Лепшы мой падарунак XVII гадавіне Вялікай Окцябрскай рэвалюцыі —гэта сканчэнне ўсёй праграмы самалёта на «выдатна».

ПРЭМІРАВАННЕ АЎТАРАЎ ФІЛЬМА „ЧАПАЕЎ"

Галоўнае кіраўніцтва кіно-фотапрамысловасці за подпісам тав. Б. Д. Шумяцкага вынесла пазаку ўсяму пастаноўчаму калектыву фільма «Чапаеў» за стварэнне першага вялікага совецкага фільма, які з велізарнай сілай паказвае героіку, абстаноўку і жывых людзей грамадзянскай вайны у першай станаўлення Чырвонай арміі. Рэжысеры С. і Г. Васільевы прэміраваны па 10 тыс. руб. кожны.

У загалоўе падкрэсліваецца выдатны ўдзел і значная дапамога ў стварэнні гэтага фільма камандзіра №-скага корпуса, былога камандзіра Чапаеўскай дывізіі І. С. Купякова і камандзіра палпофнай Ленінградскай кіно-фабрыцы №-скай дывізіі тав. Н. Д. Кавалёва.

Дырэкцыі камбіната Ленфільм пра паказана прэміраваць лепшых аўтараў, якія адымаліся ў карціне, аператараў і кіраўніка мастацка-вытворчага аб'яднання тав. Іонісяна. На іх прэміраванне выдзелена 25 тыс. руб.

МЕНСК

ТВОРЫ КЛАСІКАЎ РУСКАЙ І СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

У план выдавецтва мастацкай літаратуры на 1935 год Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі ўключыла рад твораў класікаў рускай і сусветнай літаратуры.

У першую чэргу пачнецца работа над выданнем поўнага збору твораў А. М. Горкага. У 1935 г. будуць выданы чатыры тамы.

Акрамя таго з класічнай літаратуры будуць выданы «выбраныя творы» Г. Гейне, «Фаўст» Гёте, «Гамлет» Шэкспіра, «Іліяда» Гомера, «Воскресение» Талстога, «Дворянское гнездо» і «Рудин» Тургенева, «Мертвые души» Гогаля, «Жаніцьба Фігаро» Бамаршэ і інш.

Частка перакладаў класічных твораў ужо знаходзіцца ў партфелі выдавецтва.

* **НА ФРАНЦУЗСКУЮ МОВУ** перакладзена работа вучонага спецыяліста балотнага інстытута т. Эркіна на тэму «Водныя ўласцівасці торфу». Работа перасылаецца ў камісію па скліканню міжнароднага канграса па глебазнаўству ў Версалі.

* **ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛА ПЛАН** капітальных работ кіраўніцтва добрабыту гарадзкога совета. Забрукавана каменнем і брусчаткай і капітальна адрэмантавана 116.000 кв. метраў маставых, галоўным чынам на ваколіцах горада. Упершыню ў гэтым годзе заліта асфальтам 6.500 кв. метраў бруку.

* **1.000 СВІНЕЙ** атрымлівае з Украіны для паляпшэння грамадзкага харчавання аддзел грамадзкага харчавання горспажыўсаюза. На адкормачным пункце аддзела грамадзкага харчавання ёсць 600 свіней.

* **2 НОВЫЯ АГУЛЬНАДАСТУПНЫЯ КАФЕ** з гарачымі закускамі адкрываюцца аддзелам грамадзкага харчавання горспажыўсаюза па Совецкай вуліцы і ў завулку імя Луначарскага.

* **ПЕРШЫ ПРАДОЛЬНА-СТРУГАЛЬНЫ ВАРШТАТ** выпускае завод імя Варашылава да 7 з'езда советаў. Механічны цэх пачаў ужо апрацоўку дэталей.

* **ВЫСТАЎКА ПА ТЭХНІЧНАЙ ПРАПАГАНДЗЕ** рыхтуецца да ўсебеларускага злёта зогатоўцаў цяжкай прамысловасці на заводзе «Комунар».

* **Курсы семінары па зімовых відах спорта** арганізуюцца Вышэйшым советам фізкультуры сумесна з палітсакратарам Наркамзема БССР у 50 МТС. Выкладчыкамі курсаў назначаюцца лепшыя інструктары Менска, Віцебска, Гомеля і Бабруйска. Курсы разлічаны на 600 чалавек.

Мэта курсаў — забяспечыць калгасы і соўгасы кадрамі арганізатараў-масавікоў па зімовых відах спорта.

КАЛГАСНЫ ФАЛЬКЛОР

У Менск вярнуўся экспедыцыя інстытута гісторыі і мастацтва Беларускай акадэміі навук, выкананая у Аршанскі і Сенненскі раёны для збірання калгаснага фальклора. У склад экспедыцыі ўваходзілі тт. Грынблят, Гацубін і Свабодзінскі. Сабрана багацейшы матэрыял. Запісана пяць тысячы песень, частушак і прыказак, адлюстроўваючых гаспадарчы і культурны ўздым калгаснай вёскі і рост заможнасці калгаснага селяніна.

Экспедыцыя правяла таксама работу на арганізацыі гвардзейскіх заводзе і сенненскім ільнозаводзе, дзе ўперыпыню сабраны фальклор на рабочай вуснай творчасці.

ГАНДЛЁВАЯ ХРОНІКА

* Менскі універмаг выканаў план тавараабароту за чацверты квартал на 27 лістапада на 70,6 проц. Прадана тавараў на 4.238 тыс. рублёў. Штодзённая выручка магазіна складае 92 тыс. рублёў.

* Нарком унутранага гандлю Саюза тав. Вейцар выдзеліў для Менскага дзяржаўнага універмага на 300 тыс. рублёў швейных вырабаў павышанай якасці — тонкашэрсныя касцюмы, драпавыя пальты мужчынскія, тонкашэрсныя жаночыя зімнія пальты і т. д. Апрача таго выдзелена гатовай вопраткі звычайнага ассартымента на 200 тыс. рублёў.

* 26 лістапада, у першы дзень гандлю узорнага універмага Менгорспажыўсаюза, прадана тавараў на 43 тыс. руб. Мануфактуры прадана на 20 тыс. руб. і гатовага адзення на 13 тыс. руб.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Партколегія КПК па Беларускай ССР просіць з'явіцца у партколегію КПК (Менск, памяшканне ЦК КП(б)Б, 2-ы паверх, пакой № 34) або паведаміць свой адрас, месца работы і жыхарства Пятар'ева С. І. (які раней знаходзіўся ў стара-дарожскай арганізацыі).

Просьба да ўсіх арганізацый, ведаючых месцапрабываньне тав. Пятар'ева С. І., паведаміць у партколегію КПК па БССР.

29 лістапада 1934 года ў 7 гадзін вечара ў Доме партактыва адбудуцца заняткі прапсемінара: СНІІ, канд. школ, марксіцка-ленінскіх гурткоў, пачатковых школ па ленінізму, гурткоў беспартыйных рабочых, КСМ школ.

Пасля семінара адбудзецца лекцыя для ўсіх прапагандыстаў на тэму: «Нараджэнне большавізма ў Беларусі».

Явка ўсіх прапагандыстаў абавязкова

ДОМ ПАРТАКТЫВА ПРЫ МЕНГАРКОМЕ КП(б)Б.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Гуляны кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" — Гуляны мастацкі фільм ПЕСНЯ аб ШЧАСЦІ. Звыш праграмы — КАНЦЭРТ

Гуляны кіно-тэатр „Пролетарый" — Гуляны мастацкі фільм ЧАПАЕЎ

Кіно „Інтернацыянал" — Вялікі мастацкі фільм БЛУКАЮЧЫЯ ЗОРКІ

Кіно „СПАРТАК" — Новы замежны фільм За гонар брата

Да ведама профарганізацый і праўленняў ЖАКТ'аў

ВЫДАЧА ПОЗВАЎ на выбары ў совет

праводзіцца штодзённа з 9 гадзін раніцы да 22 гадзін у горсовеце (пакой 32) за 6—7 дзён да выбарчага сходу.

Гарадская выбарчая камісія.

КАРСУД Мазырскага раёна і участка прапануе ўтсутнаму ГРАДУ Пілліну Аляксандравічу, 1887 г. нар., дзяжурнага, раней працаваўшаму на мясазаводзе „Пролетарый",—працаваў у якасці сакратара,—з'явіцца ў карсуд гор. Мозыра, БССР, або паведаміць суд аб сваім месцапрабываньні.

Усім установам, арганізацыям і асобам, ведаючым аб месцы выходжання ГРАДА, або яго смерці паведаміць аб гэтым нар суд.

Народны суддзя КОВАЛЕВА.

Інстытут масавага завочнага навучання партактыва пры ЦК КП(б)Б

Завочная партвучоба па радыё на снежань месяц 1934 г.

«Нельга кіраваць пабудовай соцыялістычнага грамадства, не аўладаўшы навукамі» (І. Сталін).

Партыйна-комсамольскі і беспартыйны актыў калгасаў, соўгасаў, МТС, раёнаў і горада!

Работнікі папітадзелаў!

Завочнікі партвучобы!

Слухачы стацыянарнай сеткі партасветы!

Інстытут пры ЦК КП(б)Б са снежня пачынае рэгулярную перадачу радыёлекцый, разлічаных на завочнікаў партвучобы, арганізаваных радыёслухачоў з партыйнага, комсамольскага і беспартыйнага актыва горада і вёскі, прапагандыстаў партсеткі і выкладчыкаў.

Лекцыі перадаюцца праз Менскую радыёстанцыю РВ-10 штодзённа, апрача 6,12, 18, 24 і 30 чысла, з 19 г. 30 м. да 20 г. 30м., а 1, 2 3, 7, 8, 9, 13, 14 і 15 апрача гэтых гадзін яшчэ днём з 14 да 15 гадзін

У снежні праз Менскую радыёстанцыю перадаюцца:

ВУЧЭБНЫЯ ЛЕКЦЫІ ПА ГІСТОРЫІ ВКП(б) І ПАЛІТЭКАНОМІІ

Курсы лекцый па гісторыі ВКП(б) і палітэканоміі пабудаваны адпаведна вучэбным планам сістэмы завочнай партвучобы. Перадача іх пачалася ў кастрычніку 1934 г. і закончыцца ў лютым 1935 г. Кожная з вучэбных лекцый паўтараецца тры разы.

ГІСТОРЫЯ ВКП(б)

Час перадачы: з 19 г. 30 м. да 20 г. 30 м.
(для завочнікаў і арганізаваных радыёслухачоў).
1, 7, 13 снежня — «Партыя ў гады рэакцыі».
2, 8, 14 снежня — «Партыя большэвікоў на чале новага рэвалюцыйнага ўздыму».
3, 9, 15 снежня — «Партыя ў гады імперыялістычнай вайны.

ПАЛІТЭКАНОМІЯ.

Час перадачы: з 14 г. да 15 г.
(Лекцыі разлічаны на слуханне іх завочнікамі партвучобы ў «дні завочніка» пад кіраўніцтвам выкладчыка інстытута).
1, 7, 13 снежня — «Тавар».
2, 8, 14 снежня — «Сутнасць капіталістычнай эксплаатацыі».
3, 9, 15 снежня — «Агульны закон капіталістычнага накаплення»

Цыкл лекцый

ПА ПРАГРАМЕ 6-МЕСЯЧНЫХ КУРСАЎ АКТЫВА КАЛГАСАЎ, СОЎГАСАЎ І МТС.

4 і 10-га снежня — «Барацьба за соцыялізм і комунізм».
(Лекцыі ў адно з гэтых чыслаў слухаецца і правяраецца груп. завочнікаў у калгасе, соўгасе або МТС пры абавязковай прысутнасці кіраўніка групы).

* * *

Інстытут пры ЦК КП(б)Б праводзіць набор на арганізаванае слуханне пасобных цыклаў радыёлекцый. Гурткі арганізаваных слухачоў скрыстваюць кансультацыйную дапамогу ад прымацоўваемых да іх кансультантаў.

Праслухаўшым усе лекцыі і здаўшым адпаведны залік выдаецца пасведчанне.

У снежні пачынаецца перадача наступных цыклаў:

Цыкл лекцый

ПА ПЫТАННЯХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛІ.

6-га снежня — «Утрыманне і догляд малочнай жывёлы зімой».
11-га снежня — «За пашырэнне аўцаводства ў БССР».
16-га снежня — «Утрыманне свіней і іх догляд».
6-га студзеня — «Догляд коней і галоўля коняскага маладняка».
11-га студзеня — «Аб пашырэнні кармовай базы».
16-га студзеня — «Хваробы хатняй жывёлы, барацьба з імі і меры іх прадухіляння».

Цыкл лекцый

ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫІ І ПРАГРАМЫ КОМІНТЭРНА.

19-га снежня —«Крах II Інтэрнацыянала і барацьба большэвікоў за стварэнне Комінтэрна».
22-га снежня — «21 умова і арганізацыйныя асновы Комінтэрна».
25-га снежня — «Пролетарская рэвалюцыя ў Германіі (1918-23 гг.)».
28-га снежня — «Совецкая рэспубліка ў Венгрыі».

19-га студзеня 35 г. — «Рэвалюцыйныя баі італьянскага пролетарыята ў 1920 г. і прыход фашызма да ўлады».
22-га студзеня — «III кангрэс Комінтэрна ў барацьбе за масы».
25-га студзеня — «IУ і У кангрэсы Комінтэрна і барацьба за большэвізацыю компартый».
28-га студзеня — «Кітайская рэвалюцыя і барацьба за Советы ў Кітаі».
19-га лютага — «УІ кангрэс Комінтэрна і яго гістарычнае значэнне».
2-га лютага — «Германская компартыя ў барацьбе з фашысцкай дыктатурай».
25-га лютага — «Лютаўскія баі аўстрыйскага пролетарыята (1934 г)».
28-га лютага — «Ідэя штурму спее ў масах».

Цыкл лекцый.

ПА ЭКАНАМІЧНАЙ ГЕАГРАФІІ СССР

21-га снежня — «Рэспублікі, краіны і вобласці СССР».
27-га снежня — «Падземныя багацці СССР».
31-га снежня — «Як змянялася размяшчэнне вытворчасці за 1-ю пяцігодку».

У студзені і лютым 1935 г. перадаюцца наступныя лекцыі гэтага цыкла:
— «Галоўныя новабудоўлі цяжкай прамысловасці ў 2-й пяцігодцы».
— «Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі па асобных раёнах у 2-й пяцігодцы».
— «Асноўныя чыгуначныя і водныя магістралі СССР».
— «Урала-Кузбаскі камбінат».
— «Багацці Совецкай поўначы і іх асваенне».
— «Праблема Вялікага Дняпра».
— «Праблема вялікай Волгі».

Цыкл лекцый.

ДА XI УСЕБЕЛАРУСКАГА І УІІ УСЕСАЮЗНАГА З'ЕЗДАЎ СОВЕТАЎ

20, 23 і 26 снежня.

* * *

АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ ЗАВОЧНІКАЎ І РАДЫЁСЛУХАЧОЎ

даюцца 5, 11, 17, 23 і 29-га снежня пасля лекцый і гутарак інстытута.

Пасылаючы запытанні, указвайце, калі хочаце слухаць адказ на іх.

ТАВАРЫШЫ!

Лекцыі і гутаркі інстытута завочнай партвучобы слухайце калектыўна ў спецыяльна-абсталяваных радыёаўдыторыях пры палітаддзелах, у калгасах, соўгасах і пры партбіўнетах

Запісвайцеся на калектыўнае слуханне ў інструктара РК КП(б)Б па завочнаму партнавучанню або зні радыёаўдыторыі.

Калектыўнае радыёслуханне будзе праводзіцца пад кіраўніцтвам кваліфікаваных кансультантаў.

У часе слухання радыёлекцыі запішыце асноўныя моманты і вынясныя для вас пытанні. Па сканчэнні слухання абгаварыце сутнасць лекцыі і запытайце ў кансультанта адказы на вынясныя пытанні.

Слухайце рэгулярна, не прапускаючы ні адной лекцыі сваёй цыкла. Пішыце нам свае заўвагі аб радыёлекцыях. Задавайце пытанні, якія ўзнікаюць пры слуханні і якія не зможаце вырашыць на месцы

Пісьмы (можна без маркі) пішце на адрасу: г. Менск, вул. К. Маркса, 47/30. ІМЗО пры ЦК КП(б)Б, радыёсектар.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

ПЛАН ВЫБАРЧЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на 29 лістапада

№№ выб. участкаў	Выбарчы ўчастак і назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.	Лік выбарщ.	Час сходу	Месца сходу	Упаўнаважаны
48	Наравозное дэпо (праваднікі, водаснабжэнне)	—	12 гадз.	Ленкуток пар. дэпо	Кудзелька
52	Завод імя Молатава	1100	16 „	Клуб імя Сталіна	Турэцкі
53	Мясакамбінат і птушкакамбінат	250	17 „	На мясакамбінаце	Юдзін
54	Газетна-паштовая кантора	390	19 „	Клуб сувязі	Позняк
55	ТЭЦ (будаўнікі і работнікі ТЭЦ).	400	19 „	Сталовая ТЭЦ	Астроўскі
56	Політэхнічны інстытут (навуковыя, адм.-тэхн. работнікі інстытута і студэнты Хімікатэхналагічнага і торфянога факультэтаў)	—	15 „	Яўр. тэатр	Лежнер
57	Горспажыўсаюз (МГРК)	826	19 „	Клуб імя VII з'езда профсаюзаў	Верба
58	Белтранс, Менкантора Белдзяржтранса, ЦП саюза шофераў	408	19 „	Клуб глухіх	Жыжуеў
59	Работнікі ГУМ'а	170	20 „	Памяшканне ГУМ'а	Кузанцоў (Горы)
60	Цагельны завод № 3 (Мядзвежына), цагельны завод № 5-6 і цагельны завод № 2-4	405	19 „	Клуб завода № 3	Шчмыкін
61	Пабудком № 4—ІСО НКВД	—	19 „	Клуб прапасветы (Комуністычн. вул.)	Серыкаў
62	Групком № 8 (пабудова тэатра), мясцком № 1 —работнікі Белпромбудтр., Пабудова гаража СНК	500	17 „	Сталовая пры пабуд. тэатра	Фінбейн
63	Служба шляху	578	19 „	Клуб „Ільіча" (таварн.)	Гінзбург
64	Рабфак політэхнічнага інстытута і інстытут аховы працы	475	20 „	Памяшк. політэхн. інст.	Ляхтыевскі
65	К І Ж	303	17 „	Памяшк. КІЖ'а	Клімковіч
66	Гарадская совецкая больніца	226	20 „	2-я сов. больніца	Лаўкова
68	Завод „Ударнік"	323	16 „	Ленкуток завода	Сафіян
69	Белдзяржвыдавецтва, Партвыдавецтва, Ваенвыдавецтва, ОГІЗ БССР	318	16 „	Дом друку (Камароўка)	Гурле
70	Мединстытут (студэнты 2-га, 3-га, 4-га і 5-га курсаў і 4-га курса рабфака)	—	20 „	Актавая зала БДУ	Гельфанд
71	Клінічны гарадок (абслугоўваючы персанал), акушорска-гінекалагічныя курсы	548	16 „	Клінічны гарадок Аўдыторыя 2-га корп.	Гінзбіна

ПЛАН СПРАВАЗДАЧНЫХ СХОДАЎ

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў на 29 лістапада

№№ выб. участкаў	Выбарчы ўчастак (назва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый)	Лік выбарщ.	Час правядзення сходу	Месца сходу	Дакладчык
110	Фабрыка Крупская (1-я смена)	953	15 гадз.	Сталовая фабрыкі	Гераўкер (ПСПСВ)
150	Тэхнікум Наргасучота, Навукова-даследчы інстытут харчовай прамысловасці	180	18 „	У тэхнікуме Наргасучота	Тавакальян
151	Работнікі Дзіфона і Цэнтральнага радыёвяшчання дома	265	20 „	Памяшк. Дзіфона	Маршак
152	Тэхнікум хлебапячэння	222	21 „	Тэхнікум	Варанкоў
153	Клінкерны завод, цагельны зав. № 8	207	19 „	Клуб клінкернага з-да	Целятнікаў
154	Цагельны завод № 1-3, Кахляны завод, Белпромбу керамсаюз, Узрыўпром, ЦП керамікаў, Белбудматэрыял	354	19 „	На цаг. зав. № 1-3 (Гутынка № 3)	Коваль
155	Пабудком № 5: пабудова Дома Чырв. арміі	225	19 „	Клуб будаўнікоў	Гарбатаў
156	Арцель „Чырвоны абутнік", апарат „Менскурпромсаюза і база Белпромгандля	295	19 „	Клуб „Чырв. абутнік" (Комунальная, 9)	Пятрухін
157	Работнікі Дзяржаўнай і Пушкінскай бібліятэк Талстога і Дзем'яна Беднага	172	20 „	Дзяржаўная бібліятэка	Александровіч
158	Беларуская Акадэмія Навук	491	20 „	Клуб акадэмістаў	Кузнецова
160	Утрыманцы па жактах №№ 4, 7, 14, 15, ЖВКТ. „Чырвоны Окцябр"	750	18 „	Балотная станцыя Клуб імя селяніна	Барысаў
161	Утрыманцы па жакту № 51	500	18 „	Клуб імя 13-годдзя	Мізенкоў
162	Утрыманцы па жактах №№ 39, 41, 42 і 43 ЖІКТ 5-ці годдзе Яўрэйскага тэатра	450	18 „	Клуб хлебазавода	Зайчык
163	Утрыманцы па жактах № 11, 26	—	18 „	Клуб Эльвода	Станкевіч

Выпускаючы—А. КРУЧКОЎ, ст. карэктар—БЯРОЗАВІК, ст. метраппаж—Н. ПЕРАКЛАДНЫЙ, ст. стэрэатыпёр—КАГАН Б., ст. друкар—АНУЧЫН.

Менск, друкарня «Заезды».

Уп. Галоўлітбала № К—6388.